Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ЛЮТАГА 2018 г. СУБОТА № 34 (28650)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

18 лютага — выбары ў мясцовыя (абласныя, гарадскія, раённыя, сельскія і пасялковыя) Саветы дэпутатаў.

**Ваш голас вельмі важны!**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў:**

*«Нават у акругах, дзе зарэгістраваны толькі адзін кандыдат у дэпутаты, выбары павінны адбыцца. Выбары ў любым выпадку трэба праводзіць. Бо, калі з ліку тых выбаршчыкаў, што прыйшлі на ўчасткі, больш за 50 % прагаласуюць супраць, то дэпутат не будзе абраны. Гэта значыць выбаршчыкі атрымаюць права выказацца. Увядзенне ж абавязковай альтэрнатывы, як зроблена ў некаторых дзяржавах, — гэта проста гандаль лаяльнасцю».*

ISSN 1990 - 763X

# АСАБІСТАЯ АДКАЗНАСЦЬ АБАВЯЗВАЕ

**Беражлівае, ашчаднае стаўленне да свайго жытла, да родных і блізкіх людзей, да ўласнай справы — гэта, падаецца, вельмі простыя, агульначалавечыя рэчы. І калі б кожны іх прытрымліваўся, глядзіш, і свет бы стаў лепшы. Гэта датычыцца не толькі таго, што напраму залежыць ад кожнага з нас, але і рэчаў глабальных — улады, сацыяльнай сферы, эканамічнага стану. Калі не даеш хабар — тым самым не дазваляеш развівацца карупцыі, трымаеш у парадку двор побач з уласным домам — робіш прыгажэйшым не толькі яго, але і горад, і краіну ў цэлым. Крыху намаганняў — а колькі карысці можа быць. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заклікаў падчас рабочай паездкі ў Слуцк усіх грамадзян актыўна праяўляць сябе і ў грамадскім, і ў жыццёвым плане.**



Фота БЕЛТА.

## Дастойная плата за добрую работу

Учора кіраўнік дзяржавы наведаў драждждавы завод і цукрарафінадны камбінат, што на Случчыне, пасля чаго сустрэўся з супрацоўнікамі прадпрыемства цукровай галіны. Галоўны пасыл беларускага лідара падчас сустрэчы — працаваць пільна, з павагай і акуратнасцю ставіцца да здабытага і імкнуцца для родных мясцін зрабіць больш, чым проста прыехаць і агледзець іх.

Адной з першых тэм, якую Прэзідэнт закрануў падчас наведвання Слуцкага цукрарафінаднага камбіната, стала заработная плата. Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, каб разрыў паміж зарплатай у снежні 2017-га і першымі месяцамі гэтага года быў мінімальны і паступова розніца, калі і была, выраўноўвалася. Асобна кіраўнік дзяржавы закрануў тэму зарплаты педагогаў: «Па настаўніках будзем разбірацца самым сур'ёзным чынам. Трэба за будучую пяцігодку і астатні час заработную плату настаўнікам падвойваць. І гэта не папулізм! Настаўнік сёння застаўся галоўным звяном у вёсцы, у малых гарадах, раённых цэнтрах».

СТАР. 2

# ПЕРШЫ. ДОЎГАЧАКАНЫ. ЗАЛАТЫ

## Ганна Гуськова стала алімпійскай чэмпіёнкай у лыжнай акрабатыцы



**Прэзідэнт Беларусі, Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка павіншаваў члена нацыянальнай каманды па фрыстайле Ганну Гуськову з заваяваннем залатога медаля на зімовых Алімпійскіх гульнях у Пхёнчхане.**

**«Абараняючы спартыўны гонар краіны, ты падарыла беларусам сапраўднае свята. Сёння ўсе з заміраннем сэрца сачылі за яркім, самаадданым выступленнем, якое прынесла нам першае, такое доўгачаканае золата Алімпіяды ў Пхёнчхане», — гаворыцца ў віншаванні.**

**Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што, паказаўшы непераўзыдзены ўзровень майстэрства і пацвердзіўшы высокі клас беларускай школы фрыстайла, спартсменка стала аўтарам перамогі ўсёй краіны.**

**Аляксандр Лукашэнка таксама павіншаваў Ганну Гуськову з прысваеннем ганаровага звання «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь» і ўзнагароджаннем ордэнам Айчыны III ступені.**



Фота БЕЛТА.

СТАР. 3

■ Еўрагульні-2019

# «НАМ ЁСЦЬ ШТО ПАКАЗАЦЬ...»

## Беларусь праз мову, гісторыю, культуру...

**Усё менш часу застаецца да 2019 года, у якім Беларусь будзе трымаць сур'ёзны экзамен перад сусветнай спартыўнай грамадскасцю. Работа па падрыхтоўцы краіны да гэтай падзеі ўжо пачалася. Мы пацікавіліся ў прадстаўнікоў Дырэкцыі Гульняў, гісторыкаў, дзеячаў культуры і прадстаўнікоў гарадскіх улад аб тым, як ідуць справы і чаго чакаць айчынным і замежным аматарам спорту ад Мінска ў 2019 годзе.**

### Мультымоўе, або Нас зразумеюць усе

Еўрагульні — гэта міжнароднае мерапрыемства, але не толькі спартыўнае, як можа здавацца на першы погляд, яно мае яшчэ і вялікую культурную частку. Таму тут Беларусь павінна прадэманстраваць не толькі добрых спартсменаў, але і ўсё багацце сваёй нацыянальнай культуры. Дырэкцыя Гульняў надае вельмі важнае значэнне менавіта гэтаму аспекту. Разважаючы ў такім кірунку, вядома, немагчыма абысці пытанне аб тым, якія ж мовы будуць суправаджаць маштабны турнір?

**Намеснік дырэктара Дырэкцыі II Еўрапейскіх гульняў Анатоль КОТАЎ** адзначае, што пэўнай дамінантай будзе англійская мова, яна прадстаўлена як афіцыйная і з'яўляецца галоўным сродкам камунікацыі з еўрапейскімі партнёрамі, а ў сваіх піяр-кампаніях, вядома, Дырэкцыя выкарыстоўвае дзяржаўныя — беларускую і рускую мовы. *«Мы жывём у нашай краіне, павінны прасоўваць нашу культуру, і таму беларуская мова будзе адным з сур'ёзных напрамкаў нашай работы. Падчас Еўрагульняў менавіта мова, культура, нашы традыцыі будуць у прыярытэце. Гэта зразумела, нават калі паглядзець на стылістыку, якая разгарнулася вакол папараць-кветкі. Гэтую старажытную беларускую легенду мы хочам данесці да ўсяго свету. Праз нашу адметнасць мы павінны паказаць, што Беларусь — гэта адна з 50 галоўных краін Еўропы са сваёй цікавай і няпростай гісторыяй, месцамі трагічнай»*, — адзначае Анатоль Анатолевіч.

СТАР. 5

# АСАБІСТАЯ АДКАЗНАСЦЬ АБАВЯЗВАЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На жаль, невысокія зарплаты атрымліваюць і работнікі дзіцячых садкоў, медсёстры і санітаркі, хоць работа ў іх каласальная, таму Прэзідэнт адзначыў, што плату за іх працу трэба паступова падымаць. Увогуле, што датычыцца росту зарплаты, то ён, перш за ўсё, павінен адбывацца за кошт прадукцыйнасці працы, каб чалавек быў загружаны, але і атрымліваў за зробленае належным чынам. Таксама рост зарплаты будзе стымуляваць і ўнутраны попыт, адзначыў беларускі лідар.

### Будзе інфраструктура — будуць і людзі

Аляксандр Лукашэнка заклікаў усіх да актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці краіны. Перш за ўсё — у добраўпарадкаванні малой радзімы. Сёлета кожны мусіць штосьці зрабіць, каб яшчэ больш прыгожай стала Беларусь. Нельга забывацца на неперспектыўныя вёскі, але ўпор на аграгарадкі будзе рабіцца і надалей. «Мы нікуды ад гэтага не дзенемся і аграгарадкі будзем развіваць, за імі будучыня нашай беларускай вёскі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, калі ў іх будзе добрая інфраструктура, то моладзь пацягнецца і на вёску, бо па-за горадам лягчэй расціць дзяцей, лепшыя экалагічныя ўмовы для жыцця. У той час як у горадзе не заўжды так лёгка знайсці работу, як можа падацца на першы погляд. І, калі малады чалавек вырашыць пераехаць, напрыклад, у невялікі горад, то тут для яго адным з галоўных стымулаў можа стаць больш даступнае жыллё.

Аляксандр Лукашэнка таксама заклікаў усіх схадзіць на выбары, якія адбудуцца ўжо заўтра (сёння яшчэ можна прагаласаваць датэрмінова). «Ногі не адваляцца», — па-народнаму сказаў кіраўнік дзяржавы і растлумачыў, што хоць сістэма мясцовых Саветаў дэпутатаў сапраўды патрабуе рэформы, але на цяперашнім этапе яна не такая шматлікая, як гэта было раней, і абсалютная большасць абраннікаў народа нават не атрымлівае за працу зарплаты (толькі старшыні). Да таго ж, у выпадку канфлікту ці надзвычайнага становішча менавіта мясцовыя ўлады будуць выступаць сувязным звяном паміж людзьмі і вышэйшымі ўстановамі.

У любым выпадку выбары — гэта праяўленне грамадскай актыўнасці, палітычнай культуры насельніцтва, да якой варта прывучаць з дзяцінства. Таму беларускі лідар прапанаваў браць з сабой на ўчасткі дзяцей, прывіваючы ім тым самым адчуванне свята ў дзень выбараў, фарміруючы іх станоўчы вобраз.

### Ёсць карупцыя — няма партфеля міністра

Адзін з супрацоўнікаў цукровага камбіната запытаў Прэзідэнта аб адстаўцы міністраў спорту і лясной гаспадаркі. Кіраўнік дзяржавы пагадзіўся растлумачыць, чаму было прынята такое рашэнне. «Вы мае выбаршчыкі, і я абавязаны перад вамі даваць тлумачэнні, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — З першых прэзідэнцкіх выбараў я дакладна народу сказаў, што карупцыі ў Беларусі быць не можа». Так, кіраўнік дзяржавы папярэдзіў міністраў, што калі раптам у іх сферы будзе выяўлена карупцыйная схема, то партфеляў давядзецца адразу ж пазбавіцца.

Напрыклад, кіраўнік Палаца спорту браў хабар ад гандляроў, якія размяшчаліся ў будынку. А дайшло да таго, што калі манахіні прыйшлі прасіць дазвол на продаж, ён і ад іх папрасіў «грашовай падзякі». «Я не веру, што міністр пра гэта не ведаў», — сказаў Прэзідэнт. Што датычыцца лясной сферы, то тут выявілі крымінальную схему: у адну з краін Еўрапейскага саюза якасную драўніну прадавалі, выдаючы яе за некандыцыю, каб не плаціць пошліны. «Ад мяне літасці не чакайце, ніхто. Не таму, што я крыважэрны, а таму, што карупцыя губіць усё», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

■ Парламенцкі дзённік

# КАБ ЗАКОНЫ НЕ БЫЛІ ПЕРАШКОДАЙ

**Збліжэнне заканадаўстваў Беларусі і Расіі стане адной з тэм для абмеркавання на V Форуме рэгіёнаў, які адбудзецца сёлета 26—28 верасня ў Магілёве. Пра гэта заявіла намеснік старшыні Савета Рэспублікі Мар'яна Шчоткіна падчас сумеснага беларуска-расійскага пасяджэння арганізацыйных камітэтаў па падрыхтоўцы і правядзенні форуму.**

Падчас яго адбудзецца пасяджэнне міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу па міжрэгіянальным супрацоўніцтве. «Адным з пытанняў, якія мы будзем разглядаць, стане маніторынг заканадаўства, Дагавора аб Саюзнай дзяржаве. Гэта вельмі вялікі пласт работы, да якой далучацца парламентарыі Беларусі і Расіі», — адзначыла віцэ-спікер. Яна нагадала, што шляхі збліжэння заканадаўстваў нашых краін абмяркоўваліся ў снежні мінулага года падчас парламенцкіх слуханняў у Бранску. «Вельмі важна, каб мы бачылі праблемы і вырашалі іх», — падкрэсліла віцэ-спікер.

Па традыцыі на Форуме рэгіёнаў будуць падпісаныя кантракты, дагаворы, пагадненні паміж рэгіёнамі і канкрэтнымі прадпрыемствамі. «Наладжванне эканамічных сувязяў, стварэнне вытворчасцяў і сумесных распрацовак, фарміраванне саюзных праграм — гэта таксама адзін з элементаў работы форуму», — дадала Мар'яна Шчоткіна.

Намеснік старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Юрый Вараб'ёў паведаміў, што зацікаўленасць у пашырэнні супрацоўніцтва ў межах Саюзнай дзяржавы выказваюць і кіраўнікі мясцовых улад, а ў аргкамітэт форуму паступаюць лісты з прапановамі, пытаннямі для ўключэння ў яго праграму.

**Вераніка ПУСТАВІТ** ■

■ Выбары-2018

# ЯК ПАКАЗЧЫК СТАЛАСЦІ

**Лідзія Ярмошына правяла сустрэчу са студэнтамі Акадэміі кіравання**

**«Удзел у выбарах — гэта паказчык асабістай сталасці і адказнасці перад грамадствам, дзяржавай», — сказала старшыня ЦВК перад пачаткам мерапрыемства.**

Колькасць маладых кандыдатаў на мясцовых выбарах адрозніваецца ў залежнасці ад узроўню Саветаў. У Мінску і абласных цэнтрах прадстаўлена вялікая колькасць прэтэндэнтаў да 31 года. Значна саступае ім сельская мясцовасць.

У працэнтных суадносінах колькасць маладых кандыдатаў зніжаецца. Гэта звязана з тым, што больш за палову прэтэндэнтаў — каля 13 тысяч чалавек — кандыдаты сельскіх Саветаў. Як адзначыла Лідзія Ярмошына, у гарадах працэнт маладых людзей, якія змагаюцца за дэпутацкія партфелі, павялічваецца.

Старшыня ЦВК ужо паўдзельнічала ў датэрміновым галасаванні. Гаворачы аб абранай кандыдатуры, яна адзначыла, што ўважліва разглядала прэтэндэнтаў. Свой голас аддала таму, хто адзіны кінуў улётку ў яе паштовую скрыню.

«Мой дом знаходзіцца на адкрытай тэрыторыі, таму апусціць улётку ў паштовую скрыню мог любы, калі б захацеў. Але не ўсе кандыдаты стварылі асабістыя выбарчыя фонды і падрыхтавалі друкаваную прадукцыю. Чалавек, які падрыхтаваў друкаваныя матэрыялы, ужо прадэманстраваў сур'ёзныя адносіны да выбараў», — пракаменціравала Лідзія Ярмошына.

Сустрэча са студэнтамі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь прайшла ў рамках рэспубліканскага праекта БРСМ «Моладзь вырашае!» Фармат мерапрыемства — «адкрыты дыялог». Асноўная тэма размовы надзвычай актуальная — «Моладзь і выбары: формула адказнасці».

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ПРАЦАВАЦЬ НА СТАБІЛЬНАСЦЬ У ГРАМАДСТВЕ

**Старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА падчас датэрміновага галасавання на выбарах кандыдатаў у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў 28-га склікання выказаў меркаванне наконт таго, якім павінен быць народны абраннік. Губернатар асабліва падкрэсліў, што прэтэндэнт на дэпутацкі мандат павінен валодаць такой якасцю, як мэтанакіраванасць у рабоце, працаваць на стабільнасць у грамадстве. Не менш важна, каб тыя, каго выбірае народ, праяўлялі ініцыятыву, падтрымлівалі зносіны з людзьмі, вылучалі ініцыятывы па паляпшэнні іх дабрабыту.**

Што датычыцца задач, якія стаяць перад будучымі дэпутатамі, то іх дакладна акрэсліў кіраўнік дзяржавы, лічыць Анатоль Ісачанка. Галоўнае іх выканаць і данесці да выбаршчыкаў.

Вяснянская выбарчая акруга, дзе галасаваў старшыня Мінаблвыканкама, адносна невялікая, у спісы для галасавання ўнесена 895 чалавек. У першы дзень датэрміновага галасавання на ўчастку № 52 асабліва актыўнасці не назіралася, адзначыла **старшыня ўчастковай камісіі Іна ДЗЯТЧЭНЯ.** У далейшым выбаршчыкаў пабольшала. На раніцу 15 лютага было выдадзена 50 бюлетэняў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ** ■

# У РОДНАЙ МОВЫ — СВЯТА



**Тыдзень роднай мовы пройдзе ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з 19 да 23 лютага. Ён прымеркаваны да святкавання Міжнароднага дня роднай мовы, які сёлета адзначаецца 21 лютага. У рамках Тыдня ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі будзе арганізаваны шэраг мерапрыемстваў.**

**19 лютага аб 11-й гадзіне** адбудзецца навукова-практычны семінар «Сусветная мовазнаўчая славістычная бібліяграфія ў інтэрнэце: прынцыпы функцыянавання і практычнае выкарыстанне ў навуковай дзейнасці». Семінар прысвечаны аднаму з найважнейшых складнікаў і інструментаў дзейнасці вучоных — навуковай інфармацыі. Удзельнікі атрымаюць рэкамендацыі па практычным выкарыстанні бібліяграфічнай базы iSybislaw і даведаюцца аб разнастайных пошукавых інструментах для эфектыўнай работы з бібліяграфічнай інфармацыяй.

**У 14.00** Савет маладых навукоўцаў арганізуе забаўляльна-адукацыйнае мерапрыемства «Мова-Quiz» для творчай моладзі НАН Беларусі. Удзельнікі гульні-віктарыны змогуць прадэманстраваць свае творчыя здольнасці, логіку, веданне беларускай мовы, а таксама факты з гісторыі, культуры і беларускай літаратуры.

**20 лютага ў 10.00** у Інстытуце мовазнаўства пройдзе сустрэча вучоных-мовазнаўцаў з вучнямі сталічнай гімназіі № 23 з беларускай мовай навучання. Для школьнікаў будзе арганізавана прэзентацыя «Гісторыя беларускага пісьменства».

**У 14.00** адбудзецца пасяджэнне круглага стала «Беларуская мова і бізнес». На сустрэчу запрошаны прадстаўнікі беларускіх фірмаў, кампаній (Velcom, запраўка А100 і г. д.), рэкламных агенцтваў, банкаў, Міністэрства гандлю і антыманапольнага рэгулявання. Кола пытанняў, якія плануецца абмеркаваць, вельмі шырокае: нацыянальная мова як важны фактар дзейнасці рэкламнай кампаніі; тэрміналагічная база рэкламы; бізнес і моўная палітыка; бізнес і нацыянальнае кнігавыданне; бізнес і лінгвадукацыйныя паслугі.

**21 лютага ў 10.00** пачне работу Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларуская мова ў сферы sacrum: гісторыя і сучаснасць». Праблемнае поле — богаслужэбная практыка, асвета і пісьменства як фактары станаўлення і развіцця еўрапейскіх нацыянальных моў; функцыянаванне беларускай мовы ў рэлігійнай сферы жыцця сучаснага грамадства і ў літургічнай. Таксама **ў 14.00** у Інстытуце мовазнаўства пройдзе прэзентацыя юбілейнага выдання «Псалтыра» ў перакладзе на сучасную беларускую літаратурную мову, падрыхтаванага трыма вядомымі ў краіне навукоўцамі — доктарам філалагічных навук прафесарам Мікалаем Прыгодзічам, кандыдатам гістарычных навук, магістрам тэалогіі Уладзіславам Завальнюком і настаўнікам-беларусаведам Валянцінам Раманцэвіч.

**У 14.30** адбудзецца круглы стол «На якой мове звяртацца да Бога», прысвечаны праблемам ужывання рэлігійнай тэрміналогіі. У ім возьмуць удзел вучоныя, перакладчыкі, прадстаўнікі розных рэлігійных канфесій.

**22 лютага ў 18.30** Інстытут мовазнаўства сумесна з Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеем Якуба Коласа праводзяць імпрэзу «Па старонках Гістарычнага слоўніка беларускай мовы». У праграме запланаваны выступленні аўтараў слоўніка, чытанні тэкстаў на старабеларускай мове, выступленне дуэта CARKA.

**Даведка**

**Міжнародны дзень роднай мовы — штогадовае свята, заснаванае ў 1999 годзе рашэннем Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА. Галоўная яго мэта — захаванне моўнай і культурнай разнастайнасці ў свеце, падтрыманне нацыянальных моў і культур, а таксама забеспячэнне права кожнага грамадзяніна карыстацца роднай мовай.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ПЕРШЫ. ДОЎГАЧАКАНЫ. ЗАЛАТЫ

**З моманту старту Алімпійскіх гульняў у Паўднёвай Карэі прайшоў роўна тыдзень. Кожны дзень у душах беларускіх балельшчыкаў цеплілася надзея. Спачатку яна ўскладалася на каманду па біятлоне, а калі ў барацьбу ўступілі фрыстайлісты, перайшла на іх. Перайшла нездарма, бо падапечныя Мікалая Казекі ўжо 20 гадоў запар не пакідаюць краіну без алімпійскіх медалёў. Аляксей Грышын, Дзмітрый Дашчынскі, Антон Кушнір і Ала Цупер прывозілі медалі «белых» Гульняў у мінулыя гады, учора залатымі літарамі ў гэты спіс сваё імя ўпісала Ганна Гуськова.**

У чацвер беларускі добра прайшлі кваліфікацыю, паказаўшы складаныя скачкі і дапусціўшы няшмат памылак, Ганна Гуськова з першай жа спробы прайшла адбор, а Ала Цупер зрабіла гэта другім скачком. Ужо ўчора ў першай спробе вырашальнага этапу Ганна паказала найлепшы вынік — 94,15 бала, у другой пры прызямленні дакранулася рукой да схілу, дзякуючы чаму яе абышлі дзве кітаянкі Сінь Чжан і Фаньюй Кун. Аднак у вырашальнай спробе Гуськова зноў прадэманстравала свае найлепшыя якасці, зарабіўшы залатую адзнаку — 96,14. Алімпійская чэмпіёнка Сочы-2014 Ала Цупер, на жаль, спынілася за крок ад п'едэстала, заняўшы 4-е месца з вынікам 59,94 бала. Пасля таго, як арганізатары вывелі на экран ацэнку і месца беларускі, Аня не змагла стрымаць слёз і выстаяць на нагах.

*«Зараз няма ніякіх думак у галаве, яшчэ не ўсведамляю, што я алімпійская чэмпіёнка. Я проста выйшла і зрабіла ўсё, што ўмею. Напэўна разуменне прыйдзе крыху пазней. Скачкі сёння атрымаліся цудоўныя, я проста абстрагавалася ад усяго. Мікалай Іванавіч абяцаў мне свой заплечнік за медаль, а за залатую ўзнагароду — не ведаю, як ён будзе разлічвацца»,* — у жартаўлівым стылі пракаментавала Гуськова.

*«Аня зрабіла ўсё шыкоўна. Яна доўга ішла да гэтай перамогі, шмат працавала, асабліва ў апошнія гады, таму яе поспех заканамерны,* — расказвае **галоўны трэнер зборнай Беларусі па фрыстайле Мікалай КАЗЕКА.** — *Мы маглі заваяваць і яшчэ адну ўзнагароду. Ала Цупер выконвала вельмі складаныя скачкі, але ў той момант, калі памылілася, я не даваў дазволу на пачатак выступлення, паказваў гэта знакамі, аднак дырэктар спаборніцтваў уключыў таймер, і Ала вымушана была пачынаць. Калі б трохі пачакалі, то, улічваючы памылкі кітаянак, маглі заваяваць яшчэ адну ўзнагароду».*

Ганна Гуськова нарадзілася ў Мінску, бацькі прывялі яе ў фрыстайл у сем гадоў, мама Гуськовай займалася мастацкай гімнастыкай, таму верагоднасць таго, што дачка абярэ менавіта гэты від спорту была вялікая, аднак тата Ані здолеў настаяць менавіта на фрыстайле. Праз два гады занятак Гуськова стала рабіць пераваροты ў паветры над вадой, яшчэ праз год дзяўчына скакала ўжо на снег. *«Мяне так зацягнула, што ні пра што акрамя фрыстайла я і не думала»,* — прызнавалася неяк Гуськова ў сваім інтэрв'ю «Звяздзе».

Першы алімпійскі вопыт быў для Ганны Гуськовай у Сочы, аднак тады ён стаў няўдалым, дзяўчына не змагла адабрацца ў фінал спаборніцтваў і заняла толькі 21-е месца. *«Калі шчыра, я не хачу нават успамінаць пра яго, тады я ўпала яшчэ ў кваліфікацыі і выбыла з барацьбы. Таму толкам не зразумела, што гэта за спаборніцтвы і паспрабавала не зацыклівацца на іх, ведала, што наперадзе новыя адказныя старты»,* — расказвала Аня.

Нягледзячы на такі невысокі вынік пасля 2014-га, менавіта Гуськову сталі называць першым нумарам беларускай жаночай зборнай па фрыстайле. Аднак хутка адбылася чарговая няўдача — паўсталі праблемы са здароўем, Аня перанесла дзве аперацыі на калене і прапусціла практычна ўвесь леташні сезон.

А вось у цяперашнім спартыўная форма дзяўчыны набірала абароты з кожным новым стартам. Спачатку яна ўпэўнена выйграла летні турнір у Швейцарыі, а потым з перамогі стартавала і на розыгрышы Кубка свету па лыжнай акрабатыцы ў кітайскім Сакрэт-Гардэне. У агульным заліку Кубка свету Гуськова стала другой, саступіўшы толькі кітаянцы Сю Ментаа. Ці думала яна тады, што галоўная перамога чакае яе ў Пхёнчхане?..

А калісьці Гуськова марыла стаць журналісткай. *«Чамусьці вырашыла, што даволі камунікабельная, лёгка знаходжу агульную мову з чужымі людзьмі. І, значыць, мне цалкам падыдзе гэтая прафесія. Праўда, апошнім часам стала заўважаць, што, даючы інтэрв'ю на камеру, з цяжкасцю падбіраю словы з-за хвалявання. Але задаваць пытанні, думаю, змагла б»,* — расказвала Гуськова.

Яшчэ Ганна асоба досыць творчая, яе цела ўпрыгожваюць татуіроўкі, на адной руцэ адлюстравана кветка з пяром, на другой — мандала і пума. Першы нацельны малюнак дзяўчына зрабіла ў 17 гадоў. Акрамя гэтага цяпер ужо алімпійская чэмпіёнка любіць фатаграфаваць і марыць шыць адзенне. *«Я ўжо нават швейную машынку купіла, але пакуль няма часу. Яшчэ вельмі падабаецца фатаграфаваць, гэта нейкага роду мастацтва. Калі ты захоўваеш моманты проста вачыма, гэта, вядома, крута, але нешта ў жыцці павінна заставацца надоўга. Адзіны спосаб захаваць гэта — фатаграфіі. Потым пераглядаю іх і захапляюся, бо немагчыма ўсё ўкласці ў памяць. Наогул, у жыцці мяне цікавяць многія рэчы, шмат чым я хацела б займацца, але на цяперашні момант аддаюся толькі спорту, фрыстайл для мяне гэта ўсё, гэта маё жыццё».*

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

# БАРАЦЬБА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

**Дзякуючы залатому алімпійскаму медалю Ганны Гуськовай, зборная Беларусі ўзнялася на 12-ю пазіцыю ў агульнакамандным заліку.**

Шанцы прасунуцца вышэй, вядома, яшчэ ёсць. У пятніцу беларускія спартсмены акрамя фрыстайла, выступілі ў спаборніцтвах па горных лыжах, канькабежным спорце і лыжных гонках.

Марына Зуева заняла 7-е месца на дыстанцыі 5000 м, вынік беларускі — 7 хвілін 04,41 секунды. Нагадаем, да гэтага Марына была 11-й на дыстанцыі 3000 м і атрымала дыскваліфікацыю на 1500 м. Марыя Шканава ў слаламе стала 28-й, а Юрый Данілачкін у супергігантце здолеў падняцца толькі на 42-і радок выніковага пратакола.

Згодна са спаборніцкай праграмай лыжных гонак, у пятніцу ў Пхёнчхане адбылася мужчынская індывідуальная гонка з раздзельнага старту на 15 км. Найлепшым з беларусаў стаў Міхаіл Сямёнаў — 40-е месца, Юрый Астапенка размясціўся на 55-й пазіцыі ў выніковым пратаколе, Аляксандр Воранаў — на 73-й.

На выхадных беларускім балельшчыкам варта зноў звярнуць сваю ўвагу на біятлон і фрыстайл, дзе ў нашых спартсменаў захоўваюцца шанцы на заваяванне ўзнагарод. Сёння ў лыжных акрабатаў пройдзе кваліфікацыя (пачатак у 14.00), дзе выступяць Антон Кушнір, Станіслаў Гладчанка і Максім Гусцік. У нядзелю, спадзяёмся, з удзелам беларусаў адбудзецца фінал, ён пачнецца таксама ў 14.00.

Апошняя індывідуальныя гонкі на Алімпіядзе-2018 пройдуць у біятланістаў, сёння на дыстанцыю з масавым стартам выйдуць дзяўчаты, гэта права заваявалі — Дар'я Домрачава, Надзея Скардзіна і Ірына Крыўко. Заўтра такі ж від праграмы адбудзецца ў мужчын.

Сёння на гарналыжную трасу выйдзе Марыя Шканава (супергігант), заўтра — Юрый Данілачкін (гіганцкі слалам). Праграму лыжных гонак у нядзелю працягнуць эстафеты 4х10.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## ■ З нагоды

# ЦІ ЛЁГКА СКАЗАЦЬ «ДАРУЙ»?

**Традыцыя рабіць гэта ў апошні дзень перад пачаткам Вялікага посту, каб уступіць у яго чыстым і пакаянным, існуе не выпадкова. Прычым прабачэння просяць не толькі ў тых, каго добра ведаюць ды трымаюць «зуб», а нават і ў незнаёмых. Здаецца, нічога няма прасцей, чым сказаць «Даруй мне». Але вельмі шмат выпадкаў, калі чалавеку нешта перашкаджае — гордасць, ілжывая ўпэўненасць у тым, што толькі яго меркаванне правільнае... Дык ці лёгка сказаць «даруй»? Ці лёгка дараваць самому?**

**Галіна БЯЛЯЕВА, завуч магілёўскай сярэдняй школы № 34:**

— Дараваць — значыць перапакутаваць. Лёгка прасіць прабачэння тады, калі табе гэта не важна. Але як дараваць блізкаму чалавеку, напрыклад, падман? З часам, магчыма, душэўны боль пройдзе, але расколіна ў адносінах застанецца. Пагледзіце, колькі вакол сямейных пар, якія пасля хатніх канфліктаў захавалі адносіны, але не перастаюць абвінавачваць адно аднаго ў былых крыўдах. Ёсць вельмі добрая прытча пра вазу, якая, пакуль цэлая, прыгожая, а калі разаб'ецца, пертвараецца ў груду аскепкаў. І нават, калі іх склеіць, той прыгажосці ўжо не атрымаецца. Як можна нешта дараваць, калі вусны шэпчуць «прабач», а душа супраціўляецца?

**Ігар МАРЗАЛЮК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры і навуцы:**

— Калі зыходзіць з хрысціянства, трэба вучыцца дараваць. Але я ніколі не змог бы чыста па-чалавечы дараваць таму, хто здраджвае Радзіме і робіць бізнес на дзецях. Усё астатняе можна зразумець. Чалавек можа ўпасці, здзейсніць злачынства, што заўгодна. Усе мы падаем, у запале можам зрабіць нешта дрэннае. Бабуля і дзядуля вучылі мяне, што трэба паспець сказаць «даруй» — прычым яшчэ калі чалавек жывы. Чым раней мы гэта ўсвядомім, тым лепш. Асабліва гэта праблема ва ўзаемаадносінах дзяцей і бацькоў, самых блізкіх людзей. Калі ты малады, бескампрамісны, табе здаецца, што бацькі састарэлі, усё робяць не так, а калі падрастаеш, адбываецца пераацэнка каштоўнасцяў. Самым блізкім людзям трэба заўсёды казаць «даруй». Бо так мала людзей, якія любяць нас проста так. У мяне выбухны тэмперамент, я ведаю свае хібы, недасканаласці, але, прынамсі, калі я адчуваю, што пакрыўдзіў чалавека, я дзесяць разоў паспрабую вырашыць гэтую праблему. Самае страшнае пакрыўдзіць проста так, ні за што.

**Андрэй КУПЦОЎ, протаіерэй кафедральнага Праабражэнскага сабора Магілёва:**

— Калі ў Госпада спыталіся, як правільна маліцца, ён пакінуў малітву «Ойча наш», яе яшчэ называюць кароткае Евангелле. І ў ёй ёсць словы «і даруй нам даўгі нашы, як і мы даруем даўжнікам нашым». Калі мы не будзем дараваць грэх камусьці, дык і Бог не будзе нам. Вядома, прабачаць абстрактнаму чалавеку лёгка, а вось на тых, хто побач знаходзіцца, часцей за ўсё спаганяюць зло. Таму важна прасіць прабачэння ў іх і ва ўсіх. Навошта прасіць? Для таго, каб Бог нам дараваў і не было ніякай крыўды. Каб мы не звязвалі сябе па руках і нагах. Нездарма кажуць, што на пакрыўджаных ваду возяць. Вораг роду чалавечага д'ябал хоча, каб мы працавалі на яго. Калі мы пакрыўджаныя, з гневам не можам справіцца, значыць не можам тварыць дабро, любіць. Мы страчваем шмат энергіі, якую нам дае Бог. Гэта тая сіла, якая дапамагае нам пераадолець усе важныя жыццёвыя сітуацыі. У Госпада спыталіся: «Колькі разоў можна дараваць свайму брату? Сем хопіць?», Ён адказваў: «Не, сем разоў па семдзесят — да бясконцасці трэба дараваць свайму бліжняму брату». Святыя айцы заклікалі: прымірыся, пакуль не зайшло сонца, каб заходзячае сонца не застала цябе ў гневе.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР ЭФІОПІІ ПАДАЎ У АДСТАЎКУ



Кіраўнік урада Эфіопіі Хайлемарыям Дэсалень падаў прашэнне аб адстаўцы. Аб гэтым паведаміла дзяржаўнае радыё Fana. 53-гадовы Дэсалень у верасні 2012 года заняў пасаду прэм'ер-міністра і старшыні кааліцыі «Рэвалюцыйна-дэмакратычны фронт эфіопскага народа». Дагэтуль ён быў намеснікам прэм'ер-міністра і адначасова міністрам замежных спраў Эфіопіі, паведамляе «Сіньхуа». Як вядома, з верасня мінулага года ў прыгранічных раёнах у штатах Аромія і Самалі адбыліся беспарадкі, па звестках статыстыкі на канец мінулага года, у выніку сутыкненняў больш за 900 тысяч чалавек засталіся без прытулку. У апошнія гады сітуацыя ў Эфіопіі нестабільная, пастаянна праходзяць пратэсты і дэманстрацыі ў розных раёнах, у прыватнасці з-за незадаволенасці насельніцтва палітыкай урада.

## ВЫЯЎЛЕНЫ НОВЫ СУПЕРВУЛКАН, ЯКІ МОЖА ЗАБРАЦЬ ЖЫЦЦІ 100 МІЛЬЁНАЎ ЧАЛАВЕК

Геолагі з універсітэта Кобэ адкрылі каля берагоў Японіі супервулкан, які змяшчае 34 кубічныя кіламетры магмы і ў выпадку выяржэння здольны забраць жыцці 100 мільёнаў чалавек, піша «РІА Навіны» са спасылкай на даследаванне часопіса Scientific repots. Адзначаецца, што выяржэнне гэтага вулкана 7,3 тыс. гадоў таму прывяло да знішчэння цывілізацыі на поўдні Японіі. Вывучыўшы кратэр супервулкана, навукоўцы выявілі купал радыусам 10 кіламетраў і вышынёй 600 метраў, напоўнены магмай. Аўтары даследавання таксама прааналізавалі няроўнасці марскога дна ў раёне вулкана і зрабілі высновы, што купал вулкана расце. На іх думку, гэты факт сведчыць аб магчымасці магутнага выяржэння, якое выкліча цунамі, здольнае дасягнуць узбярэжжа Кітая, Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі. Пры такім сцэнарыі развіцця падзей, у паветра будзе выкінуты аб'ём попелу, здольны прывесці да «вулканічнай зімы» на некаторых тэрыторыях Японіі. Навукоўцы, аднак, паспяшаліся супакоіць жыхароў, паведаміўшы, што верагоднасць такога зыходу складае 1 %.

## У БЕРЛІНЕ СТАРТАВАЎ КІНАФЕСТЫВАЛЬ




Сталіца Германіі на дзесяць дзён стала сусветнай сталіцай кіно. У галоўным конкурсе «Берлінале» ўдзельнічае 19 фільмаў, а ўсяго ў межах форуму будзе паказана больш як 400 стужак. Берлінскі фестываль адкрывае сезон кінафорумаў. «Берлінале» праводзіцца ўжо 68-ы раз. На адкрыцці быў паказаны фільм Уэса Андэрсана «Сабачы востраў».

# ІХ ГАЛАСЫ ГУЧАЦЬ У НАШЫХ ТЭЛЕФОНАХ

## Рэпартаж з кантактнага цэнтра МТС

**Калі ў вас прыгожы голас і добрая дыкцыя, вы псіхалагічна ўстойлівы, умееце кантактаваць з людзьмі, ведаеце, што Галандыя і Нідэрланды — гэта адна краіна, а не розныя, а сталіца Бельгіі — Брусель, можа, вам трэба падумаць пра работу спецыяліста ў кантактным цэнтры найбуйнейшага аператара мабільнай сувязі? Рэдкаму чалавеку ўдаецца трапіць у месца, куды штодня сцякаюцца тысячы званкоў з пытаннямі ад абанентаў МТС з усёй Беларусі. Некалькі тыдняў таму кантактны цэнтр справіў наваселле ў цэнтральным офісе кампаніі на праспекце Незалежнасці, 95 пасля глабальнай мадэрнізацыі памяшкання. Начальнік упраўлення кліенцкага сэрвісу кампаніі МТС Ірына БУРКО і начальнік даведачна-інфармацыйнага аддзела Юлія ЖЫЛЯНІНА арганізавалі для журналістаў «Звязды» імправізаваную экскурсію і заадно падзяліліся сакрэтамі будняў людзей, якія штодня знаходзяцца на «перадавой», але пры гэтым застаюцца «байцамі нябачнага фронту». У нашых з вамі тэлефонах гучаць толькі іх галасы.**

— Плошча памяшкання пасля мадэрнізацыі засталася ранейшай, але за кошт праведзенай перапланіроўкі нам удалося ўсе службы кліенцкага сэрвісу раздзяліць занальна перагородкамі. Зараз тут размяшчаюцца больш як 100 супрацоўнікаў: аператары даведачна-інфармацыйнага аддзела (кантактнага цэнтра), спецыялісты аддзела праектаў і ключавых напрамкаў абслугоўвання, група аналізу статыстычнай справаздачнасці і група, што займаецца маніторынгам якасці абслугоўвання нашых кліентаў, — уводзіць у курс спраў Ірына Бурко. — Як бачыце, мы размясцілі ўсіх, з'явіўся ў нас і асобны камфортны пакой, дзе мы можам сабрацца ўсе разам, каб абмеркаваць штосьці важнае, — служба вялікая. Але самае галоўнае — у памяшканні была зроблена шумапаглынальная мадэрнізацыя. І столь, і перагародкі паміж аператарамі цяпер абараняюць ад шуму. Мы клапоцімся пра нашых спецыялістаў, для якіх голас — галоўны інструмент. Да таго ж і адно аднаму яны таксама не перашкаджаюць, размаўляючы з кліентамі.

**«Работа непасрэдна з людзьмі — псіхалагічна вельмі напружаная, таму і супрацоўнікі працуюць пераважна маладыя».**

Улічваючы, што ў момант нашага візіту на званкі абанентаў адначасова адказвалі больш як 60 чалавек, у вялікім памяшканні былога цэха завода гадзіннікаў стаяла проста ідэальная цішыня. У поле зроку трапляюць пераважна дзяўчаты. Цікавімся, а чаму так мала ў кантактным цэнтры мужчын?

— Прадстаўнікоў моцнай паловы ў нас насамрэч няшмат, — пагаджаецца Юлія Жыляніна, — усяго 10 працэнтаў ад агульнай колькасці аператараў. Яны прыходзяць, навучаюцца, здаюць экзамен, выходзяць на лінію, але доўга там не затрымліваюцца, бо па сваіх стрэсаўстойлівых якасцях значна саступаюць дзяўчатам.



Аператар павінен быць добрым псіхолагам і не разгубіцца ў нестандартнай сітуацыі.

Інфармацыя аб вакансіях у кантактным цэнтры звычайна размяшчаецца на сайце аператара мабільнай сувязі. Патрабаванні да прэтэндэнтаў — прыемны голас, адсутнасць моўных дэфектаў, правільная мова, вышэйшая ці незавершаная вышэйшая адукацыя, веданне геаграфіі...

— Наяўнасць вышэйшай адукацыі сведчыць найперш пра агульны ўзровень развіцця чалавека і яго гатоўнасць вучыцца, — тлумачыць Ірына Бурко. — Да нас часта прыходзяць выпускнікі і студэнты старшых курсаў педагагічных спецыяльнасцяў, шмат сярод нашых работнікаў і выпускнікоў Лінгвістычнага ўніверсітэта. Але без ведання геаграфіі аператару проста немагчыма абысціся. Кліент можа знаходзіцца ў роўмінгу, патэлефанаваць, каб пацікавіцца тарыфамі мясцовых аператараў, і калі наш работнік будзе блытаць Бухарэст з Будапештам ці не зможа прыгадаць, дзе знаходзяцца Капенгаген і Лісабон, то кліент страціць свае сродкі, а мы клапоцімся пра сваіх абанентаў.



Некалькі тыдняў таму кантактны цэнтр справіў наваселле.
Ірына БУРКО (справа) і Юлія ЖЫЛЯНІНА (злева) арганізавалі для журналістаў «Звязды» экскурсію.

Аб'ём інфармацыі, якую трэба ведаць спецыялістам, што працуюць на лініі, вельмі вялікі. Кансультаваць кліентаў даводзіцца па самых розных тэмах: ад тарыфных планаў і фінансавых пытанняў да продажу абсталявання і мабільнага тэлебачання.



— Пасля ўсталявання ў 2015 годзе ў кантактным цэнтры новага праграмнага забеспячэння запісваюцца не толькі ўсе перамовы з кліентамі, але і вядзецца «запіс экрана», — расказвае Ірына Бурко. — Камп'ютар фіксуе ўсе дзеянні свайго гаспадара, каб у спрэчнай сітуацыі можна было аднавіць дзеянні аператара і праверыць іх пакрокава. За суткі кантактны цэнтр прымае каля 10 тысяч званкоў. Кожны спецыяліст адказвае за адну гадзіну ў сярэднім на 35 званкоў. А інтэрвал паміж імі складае ўсяго 3 секунды.

Між іншым, калі ў 2002 годзе на момант адкрыцця кантактнага цэнтра ў ім працавалі 24 аператары, то зараз больш як 100. Кампанія прапануе кліентам і іншыя, больш зручныя каналы, якія дапамагаюць аператыўна і бясплатна атрымаць патрэбную ім інфармацыю: праз мабільную праграму «Мой МТС», аўтаматычную сістэму маўленчага ўзаемадзеяння, анлайн-падтрымку, карпаратыўны сайт. З першай спробы вырашаецца 94 працэнты ўсіх зваротаў. Паўторна кліент звяртаецца, толькі калі аператару патрабуецца дадатковая інфармацыя, напрыклад пашпартныя даныя.

— У выпадках, калі трэба дабавіць ці, наадварот, адмовіцца ад нейкіх паслуг, змяніць тарыфны план, даведацца PUK-код, нам важна ідэнтыфікаваць абанента, — тлумачыць Юлія Жыляніна. — Увогуле, калі чалавек тэлефануе са свайго нумара, то на экране ў аператара высвечваецца ўся яго «гісторыя»: змена тарыфных планаў, знаходжанне ў роўмінгу, унясенне плацяжоў за набытае ў растэрміноўку абсталяванне, SMS-апавяшчэнні...

Пасля размовы з аператарам абаненту прапануюць адказаць на пытанні, якія датычацца работы кампаніі, і ацаніць працу канкрэтнага спецыяліста. Ці застаўся ён задаволены кансультацыяй? Зараз сярэдні бал, выстаўлены кліентамі, складае 4,9 па пяцібальнай шкале. Быў выпадак, калі адзін з супрацоўнікаў па выніках месяца атрымаў 5 балаў, — усе абаненты паставілі яму самую высокую ацэнку.

— Тэорыя і практыка — крыху розныя рэчы, — канстатуе Ірына Бурко. — Калі мы рыхтуем сваіх аператараў, ніхто не можа ведаць, як менавіта кліент сфармулюе тое ці іншае пытанне. Здараецца, што не так і проста разабрацца ў тым, што яму патрабуецца. Таму ў аператара павінны быць добрая рэакцыя і ўменне дзейнічаць у нестандартнай сітуацыі. Жартаваць таксама трэба вельмі асцярожна, бо няма гарантыі, што жарт зразумеюць. Трэба быць добрым псіхолагам, каб паладзіць з кожным кліентам, высветліць, якая інфармацыя яму патрабуецца, і аператыўна дапамагчы. Прызнаюся, што некаторых сваіх пастаянных кліентаў мы нават пазнаём па галасах. А ўвогуле пік зваротаў прыпадае на інтэрвал з 18 да 24 гадзін, — калі людзі вяртаюцца з працы.

Цікава, што актыўнасць кліентаў можа залежаць ад самых розных фактараў: працяглых свят, цёплага надвор'я, трансляцыі папулярнага серыяла, нават фаз Месяца. Летам павялічваецца колькасць пытанняў, звязаных з роўмінгам. І ў навагоднюю ноч, калі гадзіннікі б'юць 12, усе аператары кантактнага цэнтра МТС таксама знаходзяцца на «баявым пасту», бо камусьці абавязкова патрабуецца іх дапамога.

Цікавімся, як можна вытрымаць амаль бесперапынныя размовы з кліентамі?



«Голас кампаніі» Ірына СЦЯЦКО калісьці таксама кансультавала кліентаў на лініі.

— У аператараў ёсць гадзіна, каб падсілкавацца і адпачыць у спецыяльным пакоі. Акрамя таго цягам змены прадугледжаны яшчэ некалькі перапынкаў па 15 хвілін. Але, канешне, работа непасрэдна з людзьмі — псіхалагічна вельмі напружаная, — прызнаецца Юлія Жыляніна. — Сярэдні стаж працы на лініі складае 4,5 года (хлопцы затрымліваюцца на 1,5–2 гады), а далей пачынаецца ўжо эмацыянальнае выгаранне. Менавіта таму і супрацоўнікі ў нас працуюць пераважна маладыя, бо з узростам становіцца цяжэй падстройвацца пад кліентаў. А самы вялікі стаж бесперапыннай работы на лініі складае 14,5 года!

**«За суткі кантактны цэнтр прымае каля 10 тысяч званкоў. Кожны спецыяліст адказвае за адну гадзіну ў сярэднім на 35 званкоў. А інтэрвал паміж імі складае ўсяго тры секунды».**

Часцей за ўсё спецыялісты кантактнага цэнтра пераходзяць затым у іншыя падраздзяленні: паколькі ведаюць аб паслугах кампаніі абсалютна ўсё, яны проста ідэальныя супрацоўнікі для ўсіх службаў. Увогуле, у кампаніі МТС склалася практыка не запрашаць менеджараў «звонку», а выхоўваюць іх у сваім калектыве. Ірына Бурко, дарэчы, таксама пачынала свой шлях па кар'ернай лесвіцы з кантактнага цэнтра: была спецыялістам па рабоце з кліентамі, кіраўніком групы, начальнікам аддзела, цяпер узначальвае ўпраўленне кліенцкага сэрвісу.

І «голас кампаніі» Ірына Сцяцко, якая зараз працуе вядучым спецыялістам па аналізе і статыстычнай справаздачнасці, калісьці кансультавала кліентаў на лініі. Усе аўтаматычныя сэрвісы МТС «размаўляюць» яе голасам, таксама яна агучвала і запрашэнні для электроннай чаргі ў офісах кампаніі. Кур'ёзы здараліся, калі абаненты, што тэлефанавалі па 0890, чулі ў трубцы той жа голас, што і ў аўтаматычным сэрвісе. Думалі, што з імі размаўляе робат. Ірына майстар спорту па фехтаванні, захапляецца бадмінтонам. З МТС яна звязала сваё жыццё 11 гадоў таму і пра гэта ні разу не пашкадавала. Была фіналісткай міжнароднага конкурсу «Хрустальная гарнітура», які праводзіцца сярод спецыялістаў кантактных цэнтраў розных краін. Каб трапіць у фінал, трэба было напісаць эсэ, адказаць на пытанні накшталт «Што для вас кожны званок?», «Якой вы бачыце сваю работу?», прыгадаць цікавыя выпадкі са сваёй практыкі.

— Паколькі большую частку свайго часу мы праводзім на рабоце, вельмі важна, каб нам хацелася на яе ісці, і каб тое, чым займаемся штодня, прыносіла маральнае задавальненне, — падкрэслівае Ірына Бурко. — Падчас праведзенага ананімнага апытання 98 працэнтаў супрацоўнікаў нашай службы паведамілі, што яны цалкам задаволены ўмовамі, створанымі на іх працоўным месцы, і калектывам. Гэта высокі паказчык, але заўсёды ёсць куды расці...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

УНП 800013732



У асобным камфортным пакоі можна сабрацца ўсім разам, каб абмеркаваць штосьці важнае.

# «НАМ ЁСЦЬ ШТО ПАКАЗАЦЬ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Намеснік міністра інфармацыі Павел ЛЁГКІ** лічыць, што моўнае асяроддзе Еўрагульняў павінна быць гарманічна ўвязана не толькі з мэтамі і задачамі прасоўвання нашай культуры, але і стварэннем камфортнага асяроддзя для гасцей Беларусі. Каб прыезджыя маглі з максімальным эфектам увабраць беларускую культурную спадчыну, прасякнуцца духам краіны і палюбіць нашую зямлю. *«Для гэтага нам неабходна стварыць друкаваную прадукцыю: разнастайную, цікавую і, што вельмі важна, мультымоўную. Сёння мы гаворым аб англійскай, беларускай, рускай мовах, але далей гэты спіс трэба працягваць, таму што гасцей у 2019 годзе ў нас будзе шмат, — разважае Павел Мікалаевіч. — Гэтая прадукцыя павінна быць арыентавана ў першую чаргу на візуальны шэраг. Нам ёсць што паказаць, калі мы здолеем зачапіць госця прыроднай прыгажосцю, архітэктурай, то далей у ход пойдуць іншыя вербальныя формы».*

Не забудуць арганізатары і пра французскую, нямецкую, польскую, іспанскую, італьянскую мовы, на якіх плануецца падрыхтаваць буклеты і даведнікі, што раскажуць пра Беларусь, гісторыю краіны і спартыўныя дасягненні.

Павел Лёгкі таксама адзначыў, што ў піяры Еўрапейскіх гульняў упор будзе рабіцца на сацыяльныя сеткі і блогасферу. Акрамя таго, Міністэрства інфармацыі плануе праводзіць прэс-туры для замежных журналістаў, чакаецца, што ў Беларусь прыедуць калегі з Расіі і Кітая.

## Музеі, замкі, выстаўкі будуць зручнымі для гасцей

З культурнай спадчыны, якую мае краіна, важна вызначыць тое, што беларусы здолеюць паказаць гасцям Еўрагульняў за адносна кароткі час, на які будуць прыбываць госці.

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Алена АНІСІМ** лічыць, што Дырэкцыі трэба прадумаць шэраг канцэртаў сучасных беларускіх музыкаў розных жанраў, плыняў, а таксама арганізаваць выступленні адметных фальклорных гуртоў і дзяржаўных ансамбляў у дні правядзення Еўрапейскіх гульняў у Мінску. *«Такая маштабная падзея пакідае пэўны адбітак, але і дае добрыя перспектывы. Ад таго, як мы справімся з правядзеннем Гульняў, залежыць наш міжнародны імідж і ў рэшце рэшт развіццё краіны таксама. Мы маем інфармацыйнае табло для турыстаў у цэнтры сталіцы, у метро назвы станцый гучаць на беларускай мове — гэта вельмі ўдалы прыклад развіцця Беларусі для турыстаў, але я хацела б звярнуць увагу на тое, каб і ў абласных цэнтрах, раённых гарадах праца ішла ў гэтым кірунку»,* — адзначыла Алена Мікалаеўна.

**Гісторык, ганаровы старшыня Таварыства беларускай мовы Алег ТРУСАЎ** выказаў думку, што для турыстаў, якія прыедуць у Мінск падчас Еўрапейскіх гульняў, трэба распрацаваць некалькі турыстычных маршрутаў. *«Адзін з іх я назваў бы «Беларусь — краіна замкаў». Два замкі ў нас цалкам гатовыя — Нясвіж і Мір. На мой погляд, трэба тэрмінова скончыць рэстаўрацыю Лідскага замка і прывесці ў парадак Навагрудскі. Калі мы гэта зробім, госцю дастаткова чатыры дні, каб пагледзець іх. Яшчэ я раіў бы турысту завітаць у Заслаўе і Смілавічы. А галоўнае, каб мясцовыя жыхары маглі расказаць пра сваю гісторыю замежнікам»,* — дзеліцца меркаваннем Алег Анатолевіч.

Таксама гісторык выказвае думку пра тое, што Мінск павінен вярнуць сабе пешаходныя вуліцы, як некалі было на Карла Маркса.



Лідскі замак.

І дэпутат, і гісторык адзначаюць важную ролю тэлебачання ў час правядзення Еўрапейскіх гульняў. Важна, каб там гучала беларуская мова, каб турыст, уключаючы тэлевізар у кожнай гасцініцы, разумеў, у якой краіне ён знаходзіцца. Цікавыя перадачы пра гістарычных асоб і мясціны нашай краіны з субцітрамі на розных мовах стануць запамінальнымі і карыснымі не толькі для турыстаў, але і для мясцовых жыхароў.

**Намеснік начальніка ўпраўлення культуры і ідэалагічнай работы Мінгарвыканкама Аляксандр ШАСТАКОЎ** адзначыў, што на дадзены момант прапрацоўваюцца пытанні аб рэжыме работы выставак і музеяў у Мінску. Неабходна зрабіць так, каб жыхарам і гасцям сталіцы было зручна наведваць гэтыя культурныя ўстановы ў вольны ад спаборніцтваў час. Таксама Аляксандр Віктаравіч расказаў, што каля ўсіх асноўных спартыўных пляцовак у Мінску будуць размешчаны зоны гасціннасці, а сам горад у гэтыя дні будзе мець тэматычнае афармленне.

## Яшчэ ёсць таямніца

На Еўрапейскія гульні да нас прыедуць прадстаўнікі, як мінімум 50 краін, на Мінск будзе глядзець увесь свет. Плануецца, што трансляцыі Гульняў пакажуць у 160 краінах, і тут складаная задача стаіць перад рэжысёрам, які будзе ствараць цырымонію адкрыцця і закрыцця буйнога турніру. У гэтай ролі выступіць вядомы ў Беларусі **рэжысёр-пастаноўшчык Аляксандр ВАВІЛАЎ**. *«Кожны дзень, калі я прачынаюся і кожны дзень, калі кладуся спаць, адчуваю на сваіх плячах вялізны груз адказнасці. Мне б хацелася, каб цырымонія адкрыцця і закрыцця расказала пра тое, што мы ўсе разам хочам расказаць пра нашу краіну, што ў нас няма разладаў, дробязных спрэчак, а ёсць гонар за тое, што мы захавалі сябе, сваю зямлю, тую культуру, якая сёння ў нас ёсць»,* — дзеліцца Аляксандр Дзмітрыевіч.

Інфармацыя аб тым, якімі будуць цырымоніі адкрыцця і закрыцця Еўрагульняў пакуль трымаецца ў таямніцы. Вядома толькі, што над стварэннем шоу працуе вялікая каманда, у якую ўваходзяць не толькі беларусы, але і замежныя спецыялісты з Расіі, Польшчы, Балгарыі і іншых краін. Арганізатары павінны стварыць шоу, якое ўспрыме Еўропа. Рэжысёр адзначае, што гэты працэс увесь час узгадняецца з Дырэкцыяй Гульняў, Нацыянальным алімпійскім камітэтам і Еўрапейскім алімпійскім камітэтам.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

■ ТБ-ролікі і білборды

# Рэклама — рухавік... бяспекі

### Летась палова сюжэтаў была неналежнай якасці

**У мінулым годзе Міжведамасны савет па рэкламе разгледзеў 560 сюжэтаў сацыяльнай рэкламы. У асноўным гэта вонкавая і тэлевізійная. 58 працэнтаў сюжэтаў не адпавядалі стандартам якасці і былі адпраўлены на дапрацоўку.**

— Спажывец цяпер крытычна ставіцца да таго, як з ім размаўляе дзяржаўная ўлада. Таму да сацыяльнай рэкламы высокія патрабаванні, — адзначае **начальнік сектара па рэкламе ўпраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Іна ГАЎРЫЛЬЧЫК.** — Адсейваем сюжэты, дзе проста пазіцыянуецца дзяржаўны орган і яго сімволіка. Рэклама павінна працаваць: ставіць праблему і прапаноўваць яе рашэнне. Часта бываюць нараканні на нізкі ўзровень тэхнічнага і эстэтычнага выканання. Мае значэнне і творчы складнік. Заўсёды ў выйгрышы тыя ролікі, якія былі зроблены пры дапамозе прафесійных агенцтваў.

Ёсць праблема з тым, што сацыяльныя сюжэты рыхтуюцца і змяшчаюцца не на сістэмнай аснове. Выключэнне — работа Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства па падатках і зборах, апарата другасных матэрыяльных рэсурсаў. Мала ўвагі ўдзяляецца сегменту інтэрнэту.

У Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях расказваюць, што калі ствараюць ролікі і буклеты, то стараюцца падаваць інфармацыю максімальна проста і даступна для насельніцтва. Для дзяцей распрацоўваюць адмысловыя закладкі для кніжак, расклады заняткаў, размалёўкі. Самыя папулярныя відэасюжэты ведамства — «Пражыць адно жыццё — выратаваць тысячы» і «Вечная памяць нецвярозым купальшчыкам». Кожны з іх набраў у інтэрнэце па мільёне праглядаў. Добрыя водгукі атрымалі таксама білборды «Дзеці не шукаюць небяспекі. Яны проста гуляюць». Сюжэты ратавальнікі выбіралі, зыходзячы са статыстыкі няшчасных выпадкаў з малечай і школьнікамі.

— Ацаніць эфектыўнасць сацыяльнай рэкламы дапамагаюць лічбы аператыўных зводак, — каментуе **афіцыйны прадстаўнік МНС Віталь НАВІЦКІ.** — Калі ў пачатку 1990-х на пажарах гінулі сотні дзяцей, то летась — чатыры чалавекі.

Самыя папулярныя тэмы сацыяльнай рэкламы — падаткі, бяспека, турыстычны патэнцыял краіны (гістарычныя аб'екты, аграэкатурызм). Іна Гаўрыльчык заўважае, што хацелася б больш сюжэтаў, скіраваных на папулярызацыю здаровага ладу жыцця, у прыватнасці, правільнага харчавання.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■ Традыцыі

# «КАБ ХУТЧЭЙ ЗІМА ЎЦЯКЛА...»

## ТРЭБА ПАСТАРАЦЦА




**МАСЛЕНІЧНЫ тыдзень святкуюць у многіх куточках Беларусі. Па старадаўніх традыцыях гэта не проста час, калі клічуць вясну, ядуць аладкі ды паляць пудзіла зімы.**

Кожны дзень мае сваё асаблівае прызначэнне, якое вынікае з яго назвы. Панядзелак — Сустрэча, аўторак — Зайгрыш, серада — Ласунак, чацвер — Разгуляй, пятніца — Цешчын вечар, субота — Залоўчыны вячоркі і Даравальная нядзеля. Гарачыя бліны, разнастайныя вырабы мясцовых майстроў, энергічныя танцы ды заўзятыя песні напоўнілі гэтымі днямі і Ашмянскі край.

Для гасцей свята арганізатары мерапрыемства — супрацоўнікі раённага цэнтра культуры — арганізавалі ў горадзе тэматычны спектакль. У святочнай пастаноўцы не забыліся нікога. Быў тут і Ярыла — бог сонца, і Дара — багіня прыроды, маладосці і вясны, і Мяцеліца. Пад канец гулянняў ашмянцы па традыцыі спалілі пудзіла Масленіцы.



А ў аграгарадку Гальшаны арганізавалі кулачныя бойкі, хуткаснае паяданне бліноў і катанне з ледзяных горак. Казачныя персанажы Зіма, Вясна, Масленіца, Снежань, Студзень і Люты весялілі гасцей, частавалі блінамі ды вадзілі карагоды. Пудзіла Масленіцы тут прыбіралі ўсе разам, пасля чаго спалілі яго, каб «хутчэй зіма ўцякла і ўсё халоднае і злое забрала, а вясна, прыйшоўшы, усё добрае ды цёплае пакінула».

**Ірына СІДАРОК**

## Извещение о проведении очередного (годового) общего собрания акционеров общества ОАО «Амкодор-Белвар», 220005, г. Минск, проспект Независимости, 58, зал заседания Общества

Собрание состоится 20 марта 2018 г. в 14.00 по адресу: г. Минск, проспект Независимости, 58, зал заседания Общества (корпус № 30, 3-й этаж).

Орган, созывающий собрание акционеров, – Совет директоров ОАО «Амкодор-Белвар».

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 13.00 до 13.45.

Регистрация лиц, имеющих право на участии в собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия. При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (договором) (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим статус руководителя).

Повестка дня:

1. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2017 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2018 год.
2. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2017 год.
3. Утверждение распределения и использования прибыли (убытков) за 2017 год.
4. Утверждение направлений распределения прибыли на 2018 год.
5. Избрание членов Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.
6. Утверждение размера вознаграждения членам Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.

Лица, имеющие право на участие в собрании, имеют право ознакомиться с информацией о деятельности общества за отчетный период, начиная с 1 марта 2018 года, а с иной информацией (документами), подлежащими представлению при подготовке к проведению собрания, начиная с 15 марта 2018 года ежедневно (кроме субботы и воскресенья) в отделе кадров ОАО «Амкодор-Белвар» (220005, г. Минск, проспект Независимости, 58, зал заседания Общества (корпус № 30, 3-й этаж) с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Совет директоров ОАО «Амкодор-Белвар». УНП 100363840

## Извещение о проведении очередного (годового) общего собрания акционеров общества ОАО «Амкодор-Унимод», 220073, г. Минск, ул. Пинская, 18

Собрание состоится 20 марта 2018 г. в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Пинская, 18, актовый зал общества.

Орган, созывающий собрание акционеров, – Совет директоров ОАО «Амкодор-Унимод».

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 13.00 до 13.45.

Регистрация лиц, имеющих право на участии в собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия. При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (договором) (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим статус руководителя).

Повестка дня:

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2017 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2018 год.
2. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2017 год.
3. Утверждение распределения и использования прибыли (убытков) за 2017 год.
4. Утверждение направлений распределения прибыли на 2018 год.
5. Избрание членов Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.
6. Утверждение размера вознаграждения членам Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.

Лица, имеющие право на участие в собрании, имеют право ознакомиться с информацией о деятельности общества за отчетный период, начиная с 1 марта 2018 года, а с иной информацией (документами), подлежащей представлению при подготовке к проведению собрания, начиная с 15 марта 2018 года ежедневно (кроме субботы и воскресенья) в отделе кадров ОАО «Амкодор-Унимод» (220073, г. Минск, ул. Пинская, 18) с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Совет директоров ОАО «Амкодор-Унимод». УНП 100010116

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА УНИТАРНОГО ПРЕДПРИЯТИЯ «САКВОЯЖ»

| Предмет торгов | Начальная цена без НДС, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| Лот № 1. 1) Капитальное строение с инв. №130/С-26758, общей площадью 470,2 кв. м (наименование: склад № 9; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 144500000022000474 площадью 0,8146 га по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Индустриальная, д. 5У. Составные части и принадлежности: железобетонный забор, металлические ворота, водопроводная сеть, канализационная сеть, 3 железобетонные опоры, асфальтобетонное покрытие, асфальтобетонная площадка;<br>2) Капитальное строение с инв. №130/С-26762, общей площадью 475,0 кв. м (наименование: склад № 8 ГП участка красок; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 144500000022000474 площадью 0,8146 га по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Индустриальная, д. 5У. Составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие | **82 290,00** | **8 229,00** |
| Лот № 2. Капитальное строение с инв. №100/С-23990, общей площадью 178,0 кв. м (наименование: 4-квартирный жилой дом; назначение – здание многоквартирного жилого дома), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001014055 площадью 0,0547 га по адресу: г. Брест, ул. Мицкевича, д. 63. Составные части и принадлежности: сарай, уборная. | **334 000,00** | **33 400,00** |
| Лот № 3. Линия производства пенобетона и изготовления блоков, расположенная по адресу: Брестская обл., Каменецкий р-н, 172-й км, 4 юго-западнее г. Высокое | **11 942,00** | **1 194,20** |

| | |
|---|---|
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Номер р/сч для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 28 февраля 2018 г. в 12.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, а также иную информацию об объектах торгов можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 27 февраля 2018 г. до 17.00**

## К публикации Коммунального топографо-геодезического унитарного предприятия «ГОМЕЛЬГЕОДЕЗЦЕНТР» о проведении аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле № 2-А/2018, который состоится 7 марта 2018 г. (объявление опубликовано в газете «Звязда» 3 февраля 2018 г. ) добавляется лот № 4 в следующей редакции:

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций | Срок аренды, (лет) | Начальная стоимость, бел. рублей | Сумма задатка, бел. руб. | Затраты на подготовку документации, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4 | в районе улиц Фадеева – Евремова | 340100000003003245 | 0,2793 | Для строительства и обслуживания объекта общественного питания с системой по типу МакДрайв | Охранная зона сетей и сооружений канализации | 5 | 41 368,04 | 2 100,00 | 2 488,07 |

Лот № 4 выставляется на аукцион повторно, извещение опубликовано 15 августа 2017 г. и 26 октября 2017 г. в газете «Звязда»

**Контактный телефон 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.qomel.qov.by либо geodezcentr.by** УНП 400230163

**ООО «Центр Белинвентаризация»**
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**
- ✓ **Оценка всех видов собственности**

## Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 2, г. ГОМЕЛЬ» 8 (0232) 33 84 69

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Капитальное строение (котельная АБЗ) с инв. № 343/С-78629, площадью 143,5 кв. м (составные части и принадлежности: кирпичная пристройка).<br>– Капитальное строение (весовая АБЗ) с инв. № 343/С-78625, площадью 21,9 кв. м (составные части и принадлежности: кирпичный навес).<br>– Капитальное строение (производственно-бытовой корпус) с инв. № 343/С-78628, площадью 634,9 кв. м (составные части и принадлежности: кирпичная пристройка).<br>– Капитальное строение (повышенный тупик) с инв. № 343/С-78627, протяженностью 424,9 м (составные части и принадлежности: участок ж/д пути, повышенный путь).<br>– Капитальное строение (железнодорожный тупик) с инв. № 343/С-78626, протяженностью 773,2 м.<br>– Капитальное строение (артскважина АБЗ) с инв. № 343/С-79504, (составные части и принадлежности: водонапорная башня).<br>– Капитальное строение (автодорожный подъезд к АБЗ) с инв. №343/С-79525, протяженностью 328,8 м.<br>– Капитальное строение (ЛЭП 10 кВт) с инв. № 343/С-79524, протяженностью 211,5 м.<br>*Объекты расположены по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, Р-33, 57-й км. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 325400000001001321 площадью 6,5470 га* | **48 652,24** | **4 865,22** |

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | **По 26 февраля 2018 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Дата, время, место проведения аукциона | **27 февраля 2018 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с BY71BPSB30121783390109330000 в РД №300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266.<br>Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от *17.02.2018 г.* |
| Условия продажи | Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %, заключить договор купли-продажи в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Оплатить стоимость объекта, сформированную на аукционе, в течение 20 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи.<br>Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.11.2017 г. |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**

## Извещение о проведении первого открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56.

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка |
|---|
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 240100000003010147, площадью 0,0843 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, участок № 1 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Нач. цена:** 25 670,22 руб. **Размер задатка:** 1 000 руб. |
| Лот № 2. Земельный участок с кадастровым № 240100000003010140, площадью 0,0873 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, участок № 2 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Нач. цена:** 26 583,13 руб. **Размер задатка:** 1 000 руб. |
| Лот № 3. Земельный участок с кадастровым № 240100000003010142, площадью 0,0827 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, участок № 4 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Нач. цена:** 25 182,14 руб. **Размер задатка:** 1 000 руб. |
| Лот № 4. Земельный участок с кадастровым № 240100000003010150, площадью 0,0839 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, У-5 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена:** 25 547,70 руб. **Размер задатка:** 1 000 руб. |
| Лот № 5. Земельный участок с кадастровым № 240100000003010146, площадью 0,0857 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, участок № 7 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена:** 26 095,06 руб. **Размер задатка:** 1 000 руб. |
| Лот № 6. Земельный участок с кадастровым № 240100000001013993, площадью 0,1014 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пер. 5-й Кирпичный, У-1 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000В, охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, охранная зона линий связи и радиофикации. **Нач. цена:** 31 017,27 руб. **Размер задатка:** 1 000 руб. |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 23.03.2018 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 19.02.2018 с 8.30 по 22.03.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY14AKBB36423020002802000000 ф-л № 200 ВОУ ОАО «АСБ«Беларусбанк», БИК AKBBBY21200, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. **Условия аукциона:** в установленном порядке обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру»; обратиться в установленном порядке за получением разрешительной документации на строительство объекта в администрацию Первомайского района г. Витебска в срок, не превышающий 3 месяца с даты гос. регистрации права на зем. участок; в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем.участка; осуществить строительство в сроки, установленные законодательством. Для участия в аукционе приглашаются граждане, негосударственные юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, негосударственных юр. лиц Республики Беларусь). По заявлению покупателя Витебским горисполкомом может предоставляться рассрочка оплаты земельного участка |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка |
|---|
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 220882719601000038, площадью 0,2495 га по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Друевский с/с, д. Почта Абабье (участок № 8), для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (озеро Абабье), охранная зона особо охраняемых природных территорий (Национальный парк «Браславские озера»). Нач. цена: 4 000 руб. Задаток: 400 руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 20.03.2018 в 12.30 по адресу: г. Браслав, ул. Советская, 119 в Браславском райисполкоме. Срок внесения задатков и приема документов: с 19.02.2018 с 8.30 по 19.03.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY72AKBB36003120400080000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Друевский сельсовет). **Условия:** обратиться в течение 2 месяцев со дня утверждения протокола аукциона за гос. регистрацией прав на зем. участок в Браславское бюро Полоцкого филиала РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру»; разработать и утвердить в установленном порядке ПСД на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; произвести занятие (освоение) зем. участка не позднее 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство жилого дома; до начала строительства снять плодородный слой почвы в местах размещения строений и сооружений и использовать его в соответствии с проектной документацией. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ) |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка |
|---|
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 223350100001002417, площадью 0,0973 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, г. Миоры, ул. Партизанская, 38 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000В. **Нач. цена:** 5 091,25 руб. **Задаток:** 509, 13 руб. |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 20.03.2018 в 15.00 по адресу: г. Миоры, ул. Дзержинского, 17 в Миорском районном исполнительном комитете. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 19.02.2018 с 8.30 по 19.03.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY94AKBB36003210000000000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Миорский районный бюджет). **Условия аукциона:** обратиться за гос. регистрацией прав, ограничений прав на зем. участок в течение 2 месяцев со дня проведения аукциона; получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома; в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство приступить к занятию зем. участка; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ) |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка, размер начальной цены и задатка |
|---|
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 221884690601000969, площадью 0,1200 га по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Езерищенский с/с, г. п. Езерище, ул. Набережная, 5А для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (озеро Езерище). **Начальная цена**: 2000 руб. **Размер задатка:** 200 руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 22.03.2018 в 11.00 по адресу: Витебская обл., г. Городок, ул. Пролетарская, 2 в Городокском райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 19.02.2018 с 8.30 по 21.03.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY54AKBB36003160670030000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Езерищенский сельсовет). **Условия аукциона:** обратиться в течение 2 месяцев после признания аукциона несостоявшимся, либо утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона в Городокское бюро РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру» за гос. регистрацией возникновения прав на зем. участок; разработать на основании утвержденного акта выбора места размещения зем. участка с соблюдением требований градостроительного паспорта проектной документации на строительство жилого дома и согласования ее с главным архитектором района (начальником отдела архитектуры и строительства Городокского райисполкома), получить разрешение на строительство; занять зем. участок в течение 1 года со дня гос. регистрации, возникновения права на зем. участок в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство); снять из-под пятен застройки плодородный слой почвы и использовать его для благоустройства придомовой территории; после завершения строительства обратиться в Городокский райисполком за приемкой в эксплуатацию жилого дома и о переводе зем. участка из одного вида (земли под древесно-кустарниковой растительностью) в другой (земли под застройкой), зарегистрировать в утановленном порядке создание кап. строения и возникновение прав на него. Для участия в аукционе приглашаются граждане, консолидированные участники (двое и более граждан РБ) |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. **Для участия в аукционе** граждане РБ, представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения.Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

■ Нерухомасць

# УКЛАДВАЦЬ У ОФІСЫ ЗНОЎ ВЫГАДНА

**Бізнес развіваецца больш дынамічна, бо з моманту апошняга скачка курса валют прайшло ўжо больш за два гады**

**Пачатак года — час, калі арандатары традыцыйна ўздымаюць пытанне аб зніжэнні ставак арэнды па дзейных дагаворах. Аднак сёлета пытанні задаюць ужо і ўласнікі офісаў, толькі не аб зніжэнні, а аб магчымым павышэнні ставак. Наколькі такія разважанні абгрунтаваныя? Паспрабуем адшукаць аргументаваныя адказы...**



За мінулы год стаўкі прапановы арэнды офісаў у бізнес-цэнтрах у сярэднім выраслі ад 5 % да 16 %. Але спецыялісты адразу тлумачаць, што гэта — стаўкі прапановы і шмат у чым яны адлюстроўваюць толькі жаданні ўласнікаў. У той час як прымальны для рынку ўзровень арэндных ставак на пачатак студзеня гэтага года наступны:

клас «А» = 30 EUR / кв. м;
клас «В+» = 16 EUR / кв. м;
клас «В» = 10 EUR / кв. м;
клас «С» = 7 EUR / кв. м.

— Сёння на ўзровень ставак усё ў большай ступені аказвае ўплыў мінімальны аб'ём свабодных офісаў, — выказвае меркаванне **кіраўнік аддзела «Нерухомасць для бізнесу» агенцтва нерухомасці "Твая сталіца" Андрэй АСТРЭЙКА.**

## СТАБІЛЬНАСЦЬ РУБЛЯ

Пэўны аптымізм арандатарам усяляе эканамічная стабільнасць і, у прыватнасці, той факт, што з моманту апошняга скачка курса валют прайшло ўжо два гады. Стабільнасць беларускага рубля важная ў першую чаргу для арандатараў, паколькі большасць з іх па частцы выручкі «прывязаныя» менавіта да яго. У сітуацыі адсутнасці эканамічных узрушэнняў арандатары часцей пачынаюць задумвацца аб паляпшэнні ўмоў працы — змене офіса на больш камфортны, сучасны і прасторны. І не толькі задумвацца, але і пераходзіць да рэальных дзеянняў.

У якасці прыкладу Андрэй Астрэйка расказвае, што да гэтага часу ў Мінску застаецца досыць кампаній рознага маштабу, якія арандавалі офісы яшчэ ў перыяд іх дэфіцыту, выбіраючы ў спешцы з таго, што было. І па пэўных прычынах да гэтага часу вымушаныя былі заставацца ў іх, звыкшыся з дыскамфортам непрыдатных планіровак, адсутнасцю функцыянальных выгод.

## СВАБОДНЫХ ОФІСАЎ УСЁ МЕНШ

Нягледзячы на тое, што сукупная офісная плошча дзейных бізнес-цэнтраў Мінска на пачатак года складала каля 917 тысяч квадратных метраў, аб'ём свабодных і прапанаваных у арэнду офісаў быў вельмі малы — каля 25 тысяч «квадратаў» або менш за 3 % ад аб'ёму рынку. Пры гэтым вялікая частка свабодных офісаў прыходзілася на класы «В» і «С».

Па словах эксперта, за мінулы год аб'ём вакантных плошчаў паменшыўся больш чым напалову, стартаваўшы ў студзені з адзнакі 57 тысяч квадратных метраў. Прычына такога дынамічнага зніжэння збольшага крыецца ў падзенні аб'ёмаў уводу новых бізнес-цэнтраў. Напрыклад, за 2017 год у Мінску было ўведзена ў эксплуатацыю ўсяго толькі 20,7 тысячы «квадратаў» офісных плошчаў у бізнес-цэнтрах, што на 70 % ніжэй за паказчык уводу за папярэдні перыяд. У той час як аб'ём паглынання офісаў (здача ў арэнду) за 2017 год склаў каля 66 тысяч квадратных метраў.

Сёлета істотнае змяненне сітуацыі ў дачыненні да прапановы плошчаў у арэнду не прадбачыцца. Значыць, празмернасці плошчаў і выхаду з дэфіцыту на прафіцыт чакаць не варта. Усё таму, што, нягледзячы на павелічэнне аб'ёму ўводу да 45 тысяч квадратных метраў, аб'ём паглынання прагназуецца як мінімум на гэтым жа ўзроўні, а хутчэй за ўсё, нават і больш. Многае будзе залежаць ад эканамічнай сітуацыі ў краіне. Да таго ж пераважная доля плошчаў, якія ўводзяцца, будзе адносіцца да класаў «В» і «С». Таму складанасці з выбарам прасторных офісаў сёлета працягнуцца.

## У ДЭФІЦЫЦЕ — ЯКАСНЫ ПЛЮС ВЯЛІКІ

Вельмі выразна назіраецца недахоп офісаў вялікага метражу (500+ кв. м). І мацней за ўсё выяўляецца ён у сегменце якасных офісаў, і ў прыватнасці па класе «В+». Хтосьці можа запярэчыць, што ў цяперашні час якасных офісаў дастаткова — прычым у бізнес-цэнтрах не толькі класаў «А» і «В+», але нават і «В». Але, па-першае, яны ў пераважнай большасці маюць невялікую плошчу, а па-другое, не заўсёды падыходзяць арандатару.

Напрыклад, буйныя кампаніі ўсё часцей пры пошуку офіса пачынаюць з выбару бізнес-цэнтра, а ўжо потым непасрэдна офіса. Летась да такога падыходу прыйшлі і кампаніі сярэдняга фармату. І, на наш погляд, гэта лагічна, бо нават нягледзячы на тое, што сам офіс можа быць звышсучасны, бізнес-цэнтр можа не падысці. І ў бізнес-цэнтры для кампаній важна вельмі многае: пачынаючы ад такіх знешніх прыкмет, як рэспектабельнасць уваходнай групы, рэалізацыя зоны рэцэпцыі, і заканчваючы тэхналагічным напаўненнем і ўзроўнем сэрвісу. У выніку гэтага ўласнікі бізнес-цэнтраў класа «В+» у 2018 годзе будуць мець рычаг ціску на арандатараў за кошт абмежаванай прапановы буйных офісных плошчаў.

## У ЯКАСЦІ ДАХОДНЫХ ІНВЕСТЫЦЫЙ

Яшчэ адзін фактар, які пакуль яшчэ неістотна, але ўсё ж пачынае аказваць уплыў, — гэта іх інвестыцыйная прывабнасць.

У сувязі са зніжэннем арэндных ставак, якое назіралася ў 2014—2015 гадах, у многіх склалася меркаванне, што даходнасць ад здачы ў арэнду камерцыйнай нерухомасці зменшылася да зусім нецікавых значэнняў. Аднак гэта не так. Цяпер пры здачы ў арэнду офісаў у бізнес-цэнтрах можна разлічваць на прыбытковасць каля 7 % гадавых пасля выплаты падаткаў, што значна вышэй за даходнасць дэпазітаў і вышэй нават за некаторыя валютныя аблігацыі.

Аднак эксперты рынку нерухомасці перасцерагаюць: не кожны офісны аб'ект зможа забяспечыць падобную даходнасць. У той жа час найбольш ліквідныя офісы могуць даваць прыбытковасць і вышэй за 7 % — напрыклад, даходнасць офісаў з дзейнымі дагаворамі арэнды складае 11—12 % гадавых.

Тыповая інвестыцыйная здзелка выглядае наступным чынам: офіс плошчай каля 100 квадратных метраў у бізнес-цэнтры класа «В» набываецца па кошце 1300—1500 долараў (у залежнасці ад планіроўкі і якасці апрацоўкі) і далей здаецца ў арэнду па стаўцы 12—14 EUR за квадратны метр. Пры інвестыцыйнай куплі офіса, акрамя яго кошту, неабходна старанна аналізаваць яго бягучую і прагнозную прывабнасць для арандатараў. Бо менавіта гэтым будзе вызначацца яго даходнасць у перыяд акупнасці. Дастаткова прыкладаў, калі на працягу першых некалькіх гадоў аб'ект прыносіць чаканую прыбытковасць, а ў далейшым інвестар сутыкаецца з вялікімі цяжкасцямі пры пошуку арандатараў.

Калі шукаем аб'екты для інвеставання, мы вывучаем запыты арандатараў па кожным з сегментаў якасці ў дынаміцы, ацэньваем не толькі сам офіс, але і бізнес-цэнтр, у якім ён размяшчаецца: улічваем бягучае і перспектыўнае акружэнне, а таксама планы па ўводзе новых плошчаў і многае іншае. Толькі ў гэтым выпадку можна аб'ектыўна ацаніць ліквіднасць таго ці іншага офіса, у той час як многія зыходзяць толькі з цаны і якасці апрацоўкі.

## НА ПРАЦЯГУ ГОДА...

На думку Андрэя Астрэйкі, сёлета пры захаванні бягучай эканамічнай сітуацыі рост ставак арэнды магчымы ў першую чаргу па класе «В+», паколькі менавіта ў гэтым сегменце будзе паўлічвацца попыт, які і далей будзе перамяшчацца ў бок аб'ектаў, уведзеных у эксплуатацыю ў 2014—2017 гадах. Пры гэтым аб'екты павінны мець палепшаныя тэхніка-эксплуатацыйныя (сістэма энергазберажэння, кандыцыяnaванне, сістэма кантролю доступу) і архітэктурна-планіровачныя характарыстыкі.

Патрабаванні кліентаў зробяцца больш жорсткімі, з прычыны чаго пераважна будуць разглядацца аб'екты з добрай транспартнай даступнасцю і якія маюць развітую інфраструктуру і забяспечаныя дастатковай колькасцю парковачных месцаў.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

■ Прэцэдэнт

# ТУТ БУДЗЕ СКВЕР!

## ЖЫХАРЫ ЗЯЛЁНАГА ЛУГУ АДСТАЯЛІ ЗЯЛЁНУЮ ЗОНУ

**Гэты канфлікт паміж забудоўшчыкамі і гараджанамі далёка не першы. Але рэдкі тым, што жыхары змаглі адстаяць свой раён. Ініцыятыўная група сабрала каля шасці тысяч подпісаў супраць забудовы зялёнай зоны ўздоўж сталічнай вуліцы Каліноўскага, дзе цяпер праходзяць лініі электраперадачы. І гарадскія ўлады прыслухаліся.**

Мінулым летам на грамадскае абмеркаванне быў вынесены дэталёвы план мікрараёна Зялёны Луг, а менавіта тэрыторыі ў межах Лагойскага тракту — вуліцы Сядых — вуліцы Кедышкі — вуліцы Славінскага — паўночнай мяжы ландшафтна-рэкрэацыйнай зоны 320 ЛР. Згодна з ім, у старых дварах на месцы дзіцячых пляцовак збіраліся збіць падземныя паркоўкі. А ўздоўж вуліцы Каліноўскага, дзе знаходзіцца зялёная зона, кабліраваць лініі электраперадачы, і на тэрыторыі, якая вызвалілася, узвесці тры жылыя кварталы з крамамі.

— Раён сфарміраваўся ў канцы 1960-х — пачатку 1970-х гадоў, — расказвае **прадстаўнік ініцыятыўнай групы Людміла БЯЛЯЕВА-ГУНДОРЫНА.** — У свой час ён атрымаў прэмію архітэктурнай супольнасці як раён, ідэальна сфарміраваны для жыцця. Такі горад у горадзе, дзе ўсё прадугледжана, каб людзі тут працавалі, жылі, адпачывалі. Раён будаваўся з навуковым абгрунтаваннем, усё было разлічана.

Мясцовых жыхароў турбавала тое, што яны застануцца без зялёнай зоны, дзе прывыклі прагульвацца. Да таго ж яна з'яўляецца «паветраным калідорам», які хоць неяк ратуе ад выкідаў завода «Тэрмапласт». «У нас з-за гэтага шмат дзяцей-алергікаў, — заўважае Людміла. — Калі вырасце сцяна 19-павярховых панэлек, мы проста задыхнёмся». Падчас грамадскага абмеркавання на пытанне "Чаму тут вырашылі будаваць дамы?» архітэктары адказвалі, што ў гэтай тэрыторыі высокі горадабудаўнічы патэнцыял і яго трэба выкарыстоўваць па прызначэнні — толькі пад жыллё. Але згодна з Генеральным планам Мінска на ёй можна размяшчаць і аб'екты азелянення — сады, скверы, бульвары.

У прэзентаваным праекце былі таксама істотныя разыходжанні ў лічбах. У адным месцы пісалася, што жыхароў у мікрараёне, з улікам узведзеных кварталаў, стане на тры тысячы больш, у іншым — на пяць. Пры гэтым новых сацыяльных аб'ектаў не прадугледжвалася. А значыць, паліклінікі і дзіцячыя садкі пасля ўшчыльнення былі б перагружаныя.

— Забудоўшчык збіраўся ўрэзацца ў цеплацэсеткі, нагрузіць сістэму яшчэ больш, — дзеліцца Людміла. — Астатнія кварталы тады застануцца без цяпла. І так у адных кватэрах холадна, а ў іншых, наадварот, загорача, бо адкрыты ўсе вентылі, каб данесці цяпло да дальніх дамоў.

У выніку праект адправілі на дапрацоўку. Ініцыятыўная група сабрала заўваг на 30 лістоў. Не проста скаргаў накшталт «новы квартал будзе псаваць від з акна», а абгрунтаваных прэтэнзій, з адсылкамі да нормаў. За тры тыдні пад імі сабралі амаль шэсць тысяч подпісаў. На тэрыторыі ўздоўж вуліцы Каліноўскага гараджане прасілі зрабіць сквер.

— Раёну таксама не хапае спартыўных пляцовак. Дзецям няма дзе займацца, выйсці ў футбол пагуляць. Гэта пытанне здароўя наступнага пакалення, — упэўнена Людміла.

Зварот разгледзелі ў Мінгарвыканкаме. Нядаўна жыхары атрымалі адказ: скверу быць. «З улікам прапаноў удзельнікаў грамадскага абмеркавання дэталёвага плана ў рашэнні ўнесены змены, якімі запланавана выканаць на другі этап рэалізацыі дэталёвага плана (пасля 2022 года) рэканструкцыю і кабліраванне паветраных высакавольтных ліній электраперадачы ўздоўж вуліцы Каліноўскага на ўчастку ад Лагойскага тракту да вуліцы Сядых для наступнага змяшчэння аб'ектаў азелянення», — сказана ў адказе **старшыні камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама Паўла ЛУЧЫНОВІЧА.**

Яшчэ раней у падтрымку дрэў і сквераў выказваўся Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. «Замест таго каб парк дзесьці закласці ці ў парадак прывесці, вы пачынаеце штампаваць жыллё. Месца няма, дзе яго будаваць?» — адзначаў ён на нарадзе ў кастрычніку.

У гэтым плане цікавы прыклад Масквы, дзе рэалізуецца праграма рэнавацыі. Старыя кварталы зносяцца, а на іх месцы ўзводзяцца новыя жылыя комплексы. У чым плюс? Замест пяці- будуюцца дваццаціпавярховікі: усе свабодныя кватэры забудоўшчык распрадае і атрымлівае прыбытак.

Нашы забудоўшчыкі таксама будуць вымушаны шукаць новыя шляхі. Калі зялёныя зоны, якія можна «засадзіць» дамамі, скончацца, у іх проста не будзе іншага выйсця.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■

■ Вернісаж

# ДОМА!..

## Цёплыя рэчы Валерыя Песіна

**МАСТАК Валерый Песін, які часта аказваецца ў еўрапейскіх краінах альбо ў Расіі, дзе праходзяць яго выстаўкі, лагічна звярнуўся да тэмы дома. І падышоў да яе з розных бакоў: дом для мастака — гэта сімвал не толькі шчасця і ўтульнасці, але і мінулага.**
**У гэтыя дні яго выставачны праект (а гэта каля сарака вобразных абстрактных твораў, якія мастак напісаў за апошнія дзесяць гадоў) пад адпаведнай назвай «ДОМ» прадстаўлены ў сталічнай мастацкай галерэі «Арцэль».**

Ідэя праекта «ДОМ» з'явілася ў Валерыя Песіна сама сабой, бо яго канцэпцыя сугучная агульным для творчасці мастака паняццям і каштоўнасцям. Дом для Валерыя — гэта месца, дзе пачынаецца, праходзіць і заканчваецца жыццё. На думку творцы, ён нясе ў сабе памяць роду і па кроплі аддае нам нашу памяць, дзяцінства, мінулае, а магчыма, нават прадказвае будучыню.

Для Валерыя Песіна вельмі важнае паняцце блізкіх рэчаў, ён можа напісаць цэлую гісторыю пра крэсла з майстэрні. Аўтар любіць паўтараць, што яго нацюрморты, на якіх адлюстраваны простыя рэчы накшталт кубка, лыжкі, стала, — гэта не прадметы побыту, а носьбіты цёплай гісторыі.

Магчыма, феномен папулярнасці мастака заключаецца ў тым, што яго работы шмат у чым сугучныя мысленню сучаснага чалавека. Пры вялікім патоку і аб'ёме інфармацыі, хуткай змене фактаў і падзей мы адчуваем мімалётнасць, недахоп паўнавартаснасці жыцця. Творчасці Валерыя Песіна ўласцівыя недагаворанасць, фрагментарнасць і ў той жа час глыбокі псіхалагізм.

— Ідучы па дарозе ў майстэрню або назад, ён назірае за прыродай, вуліцай. Заўсёды кажа, што галінка, якая ўпала на дарогу, можа быць абсалютна непрыгожай, але яна ў яго выклікае эмоцыі, і ён не можа яе не напісаць, таму што ў ёй убачыў характар, пэўны настрой, — расказвае **мастацтвазнаўца Наталля СЯЛІЦКАЯ**. — Валерый у жывапісе не выказваецца адкрыта, Гэта мастак нюансу і намёку. Яго творы пазбаўлены літаратурнасці, апавядальнасці, ён увесь час імкнецца да мінімалізму і мінімальнымі сродкамі стварае цэласны мастацкі вобраз.

Валерый Песін шмат працуе і спрабуе асэнсаваць тое, што напісаў раней. Гэта дае яму магчымасць факусаваць увагу на рэчах, якія сталі для яго асаблівымі, блізкімі. Майстар параўноўвае свае карціны з вокнамі, якія адкрываюць свет памяці, асацыяцый, уражанняў і якія ва ўсіх розныя.





— Ён дзівосны майстар, мастак-эрудыт. Вельмі шмат чытае, захапляецца паэзіяй. Кажа, што, калі б у яго былі здольнасці пісаць вершы, ён бы з задавальненнем паглыбіўся ў паэзію, але з жывапісам пакуль атрымліваецца лепш, — дзеліцца Наталля Сяліцкая. — Яго асаблівасць у тым, што ён рознабаковы майстар. Пастаянна ў пошуку сюжэтаў, шмат падарожнічае і ўмее разважаць. Мне здаецца, што ён сам сабе рэжысёр, менавіта таму ад яго твораў вее шчырасцю. Вядома, шмат хто бачыць толькі бок поспеху мастака, але трэба разумець, што за жыццём гэтага чалавека — велізарная праца над сабой. Безумоўна, Песін — мастак, які зрабіў сам сябе.

**Вікторыя АСКЕРА**

■ Кінакрокі

# Крызіс і пачуццё гумару

## Пра Уладзіміра Мулявіна знялі тэлевізійны фільм

**У кантрасным зацішшы пасля юбілейнага 2016 года, калі 75-годдзе знакамітага песняра адзначалі і ў тэатрах, і на канцэртных пляцоўках, і ў музеях, фільм «Песняр. Сэрцам і думамі» Уладзіміра Арлова прыходзіцца дарэчы. Пачынаецца ён з «Малітвы» і заканчваецца «Родным кутом». Зняты студыяй гістарычных фільмаў «Майстэрня Уладзіміра Бокуна» па заказе Міністэрства культуры.**



Карціна сабрала ў сабе ўрыўкі з інтэрв'ю, эпізоды з сямейнага архіва, архіўныя відэа канцэртаў і выступленняў, а таксама, што не менш каштоўна, расказы дачкі Марыны Мулявінай, паплечнікаў і тых, хто працаваў з музыкантам. З песняроўскай каманды тут можна пачуць Алега Аверына, Анатоля Кашапарава, Алега Моўчана, Уладзіслава Місевіча, Аляксандра Кацікава і іншых. Фігуруюць у фільме рэжысёр Барыс Луцэнка, пісьменнік Валянцін Тарас, мастак Георгій Паплаўскі. Праз іх вочы дакументальны фільм без асаблівай засяроджанасці на нечым канкрэтным паказвае розныя бакі асобы Уладзіміра Мулявіна і розныя моманты з гісторыі «Песняроў».

Хоць і пачынаецца ўсё з крызісу 1990-х, калі калектыў не мог вярнуць былой папулярнасці, а паміж Мулявіным і іншымі музыкантамі бэнда ўсталявалася непаразуменне. У 2001 годзе ў Маскве адбыўся юбілейны канцэрт «Песняроў», і аўтары фільма задаюцца пытаннем, чаму на ім амаль не прысутнічалі былыя паплечнікі і аднадумцы галоўнага героя. У пэўным сэнсе гэты крызіс і стасункаў, і самога калектыву стаў драматычным лейтматывам дакументальнага фільма, хоць у цэлым ён лёгка пераскоквае і на запоўнены Алімпійскі, і на пачуццё гумару Мулявіна з прыкладамі жартаў.



Дачка і ўнук Уладзіміра Мулявіна.

Таму ў цэлым «Песняр. Сэрцам і думамі» стане правадніком па пэўных старонках гэтай гісторыі і раскажа, напрыклад, як у 1970-м «Песняры» сталі лаўрэатамі чацвёртага ўсесаюзнага конкурса артыстаў эстрады ў Маскве, альбо як выступілі перад прафесійнай публікай у Канах і сарвалі яе апладысменты, альбо аб сутыкненні з цэнзурай, калі Уладзімір Мулявін адстаяў вершы з песеннага спектакля «Праз усю вайну».

Пра спектакль, дарэчы, разам з пісьменнікам Валянцінам Тарасам расказваецца асобна як пра кампраміс паміж вялікімі формамі і песнямі, якіх чакала публіка, і як пра трыумф. Частка хранаметражу адведзена гучанню «Песняроў» у кіно, напрыклад у музычным фільме «А таксама цырк». Калі яго здымалі ў рэальным цырку на рэальным прадстаўленні, гледачы нават не чакалі, што ў канцы відовішча на арэну разам з цыркачамі выйдуць «Песняры» і заспяваюць. Мюзікл «Ясь і Яніна», мастацкі фільм «Міравы хлопец», мульцік «Квака-задавака»...

Рэжысёр Уладзімір Арлоў падыходзіць да асобы знакамітага песняра без сантыментаў, од і ўсхваленняў (з вуснаў Мулявіна тут можна пачуць нават крыўдныя рэчы), але з належным піетэтам. Карціна змяшчае ў сабе цікавыя знаходкі, такія як інтэрв'ю музыканта, і вуснамі Уладзіміра Мулявіна кажа, што «Песняры» вельмі абавязваюць, гэта вялікае слова, не проста назва альбо гандлёвая марка, а вобраз мыслення, вобраз жыцця, ой, гэта вельмі шмат».

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ**

■ Прастора

# Георгій ЗАБОРСКІ: «БУМ КУЛЬТУРНЫХ СТАРТАПАЎ СТАНЕ НОВЫМ ВІТКОМ ЭКАНОМІКІ»



**НЕКАЛЬКі месяцаў таму адна з найпапулярнейшых сталічных вуліц Кастрычніцкая ўзбагацілася на яшчэ адно «тусовачнае» месца. Памяшканні Мінскага завода Кастрычніцкай рэвалюцыі сталі культурным інкубатарам і культурным акселератарам «Ок16», дзе ўжо сёння праводзяцца канцэрты акадэмічнай музыкі, адукацыйныя мерапрыемствы і падзея гэтых дзён — фестываль пластычнага тэатра «ПлаSтформа». Новую для сябе прастору набыў Белгазпрамбанк, вядомы сваёй карпарацыйнай калекцыяй з творамі Марка Шагала і Хаіма Суціна, фінансаваннем тэатральнага фестывалю «ТЭАРТ», стварэннем краўдфандынгавай пляцоўкі «Вулей» — адным словам, актыўнасцямі ў культурнай сферы краіны. Адкрыццё «Ок16», з аднаго боку, пацвярджае пэўныя сталічныя тэндэнцыі, з другога, новае месца выступае з унікальнай канцэпцыяй, пра якую мы распыталі ў кіраўніка праекта Георгія ЗАБОРСКАГА.**

***— Выкарыстанне заводскіх памяшканняў — ужо не новая практыка, і адкрыццё культурных прастор у Мінску стала пэўнай тэндэнцыяй. Значыць, калі адкрываецца новая незалежная пляцоўка, яна павінна прапанаваць нешта, што ніхто іншы пакуль не прапанаваў. Што прапануе «Ок16» з таго, чаго не стае Мінску?***

— Для адказу трэба раздзяляць «Ок16» сёння і «Ок16» праз трычатыры гады, калі поўнасцю скончыцца рэканструкцыя. Наша ключавое адрозненне ў самой геаметрыі прасторы: вельмі высокія столі і адсутнасць калон дазваляюць пераўтвараць памяшканне ў тэатральную залу ў адрозненне ад многіх лофтаў, цудоўных у якасці галерэй і для арганізацыі хэпенінгаў, невялікіх канцэртаў і кірмашоў. Аб'ектыўна толькі ў нас прастора дазваляе гледачу бачыць сцэну з любога месца, таму мы можам стаць пляцоўкай для альтэрнатыўнага эксперыментальнага тэатра. Да таго ж «Ок16» — гэта вялікая інфраструктура: не проста зала і не проста шэраг памяшканняў, а вялікі кавалак нерухомасці, які дазваляе правесці фестываль на пяць тысяч чалавек — падзею гарадскога маштабу, культурную, адукацыйную альбо ў сферы IT.

***— Тут можа змясціцца пяць тысяч чалавек?***

— У суме ва ўсіх залах. Мы адкрываем іх па адным, пакуль мы можам ахапіць пяцьсот чалавек, з першага сакавіка будзе змяшчацца ўжо каля паўтары тысячы, с першага верасня — дзве з паловай тысячы і гэтак далей. «Ок16» — не адна зала, а дваццаць памяшканняў, у якіх паралельна могуць адбывацца розныя рэчы, таму IT-канферэнцыю можна ў перспектыве пераўтварыць у цэлы ўніверсітэт. Яшчэ адным нашым адрозненнем з'яўляюцца механізмы, якія дазваляюць кансультаваць і развіваць праекты. Напрыклад, фестываль «ПлаSтформа» прыйшоў да нас з невялікімі бюджэтам і сцэнічным актывам, але, калі праект нам цікавы, наша сістэма дазваляе знайсці дадатковыя фінансаванне, абсталяванне, акцёраў, мы можам арганізаваць лекцыі. Прычым у нас няма ўласнага мастацкага альбо тэатральнага густу ў адрозненне ад лофтаў з канкрэтнай эстэтычнай арыентацыяй, мы ўлічваем погляды розных экспертаў, нават калі яны радыкальна розныя, таму ўсё, што можна развіваць, мы будзем развіваць. Цікава таксама паэксперыментаваць — паказаць у «Ок16» нешта масавае і таго ж гледача захаваць для ўльтраканцэптуальных рэчаў, зрабіць так, каб ён іх убачыў, растлумачыць, як глядзець гэты авангард. Лофтавае поле Мінска цудоўнае, але гэта закрытыя суполкі (першапачаткова і ў Маскве, і ў Берліне так было). Калі ты належыш пэўнай субкультуры, то заходзіш у лофт і адчуваеш сябе добра, а калі ты, умоўна кажучы, пенсіянер, які любіць класічныя музеі, — табе няўтульна, на цябе ніхто не звяртае ўвагі і не тлумачыць, якія тут правілы паводзін. Мы, наадварот, імкнёмся стаць сучаснай альтэрнатыўнай культурнай пляцоўкай, але для кожнага.

***— Пяць тысяч наведвальнікаў — гэта, канешне, добры план, але як вы плануеце прыцягнуць такую колькасць гасцей, улічваючы, наколькі актыўна ў нас у прынцыпе наведваюцца культурныя мерапрыемствы?***

— У першую чаргу праз падрыхтоўку публікі. Мы ўпэўнены, што сучаснае мастацтва і сучасныя тэхналогіі могуць быць цікавымі масам, калі прапаноўваць спосабы іх разумець. На «ПлаSтформу» прыйдзе шмат гледачоў, якія ніколі не бачылі пластычны тэатр, але мы праводзім лекцыі, забяспечваем інтэрнэт-публікацыі, якія тлумачаць, як тут што працуе. А яшчэ праз дружалюбнасць. У першай прасторы «Месца» я на ўваходзе сустракаў кожнага наведвальніка і расказваў, што тут можна рабіць. За кошт гэтага лофт станавіўся дружалюбным той публіцы, якая б інакш там згубілася. Для мяне добрым паказчыкам з'яўляецца тое, што людзі з асяроддзя маіх бацькоў ходзяць у «Ок16» на класічныя канцэрты, то-бок гэтая прастора можа падысці для розных пакаленняў, а значыць, прыцягнуць пяць тысяч вельмі розных людзей. Трэба проста выйсці за рамкі артсубкультуры, якая прызвычаілася хадзіць па лофтах. Гэта, дарэчы, ужо адбываецца паўсюль: на адкрыцці «ПлаSтформы» ў прасторы «Верх» я бачыў шмат людзей, якія са здзіўленнем глядзелі на рэвіталізаваны завод, але прыйшлі з адкрытай да яго цікавасцю. Недзе дваццаць працэнтаў з іх у «Фэйсбуку» напісалі жорсткія каментары, затое астатнія адгукнуліся станоўча.

***— Растлумачце, калі ласка, азначэнні «культурны інкубатар» і «культурны акселератар», якімі вы характарызуеце «Ок16».***

— Гэта тэрміны з бізнес-свету, свету стартапаў. У інкубатары вялікай колькасці маладых камандаў даецца шанц з нуля на льготных умовах стварыць, напрыклад, свой бізнес. Акселератар — месца, куды прыходзяць ужо жывы праект, каб вырасці ў якасці, памерах і эфектыўнасці. «Ок16» — і інкубатар, і акселератар культурных праектаў. Мы хочам стаць своеасаблівай пясочніцай, куды можна прыйсці са сваёй камандай і з нуля нешта стварыць, але асноўная наша мэта — дапамагчы праектам, якія ўжо існуюць, вырасці за рамкі маленькіх незалежных прастор, з аўдыторыі ў некалькі дзясяткаў чалавек да некалькіх сотняў. Наступным мы запусцім фінцех-інкубатар, то-бок інкубатар праектаў, звязаных з фінансавымі тэхналогіямі. Нам гэта цікава, таму што фінцех вельмі цесна ўзаемадзейнічае з культурай, напрыклад, на краўдфандынгавай пляцоўцы «Вулей» большасць праектаў — культурныя, толькі з дапамогай «Вулля» яны атрымліваюць сродкі для рэалізацыі. Мы разумеем, што культура мае патрэбу ў новых інструментах, а новыя інструменты маюць патрэбу ў новым рынку, да таго ж культура здольная паскараць тэхналагічнае развіццё, таму мы ўпэўнены, што бум культурных стартапаў стане новым вітком эканомікі.

***— Чаму вы ў гэтым упэўнены?***

— У гонку ўступаюць розныя бачанні наступнага этапа: тэхналогіі і дроны альбо культура і пошук сэнсу жыцця. Добрым прыкладам з'яўляецца так званы «фіндэсекль» — перыяд, што ахопліваў канец XIX і пачатак XX стагоддзя і пачынаецца з ультратрадыцыйнай віктарыянскай Англіі, а заканчваецца рускім авангардам. Тэхналогіі рванулі наперад, але яшчэ мацней рванула культура, што карысталася тэхналагічным прагрэсам, але яго апярэджвала, у тым сэнсе, што асвойвала свет і рыхтавала яго да будучыні. Прыкладна за пяцьдзясят гадоў жывапіс ад рэалізму прыйшоў да абстракцыянізму, Кандзінскага і «Чорнага квадрата» Казіміра Малевіча, а калі б не было «Чорнага квадрата», уся тэхналагічная гісторыя XX стагоддзя была б іншай. Мы б не маглі карыстацца сімваламі на экране смартфона, калі б нехта не навучыў нас, што нерэалістычная выява можа быць каштоўнай. Калі б мы па-ранейшаму малявалі паненак у крыналінах, не было б смартфонаў: уменне ўспрымаць абстрактныя вобразы зарадзілася ў матэматыцы ды мастацтве, а вырасла пасля ва ў тым ліку лічбавую рэвалюцыю. Мы верым, што пачынаецца нешта падобнае, але ўжо са сваім парадкам дня. Даводзіцца зноў шукаць адказы на пытанні, што мы тут робім альбо як змераць поспех — аўтамабілем, магчымасцю вандраваць ці смачным флэт уайтам з раніцы? У XX стагоддзя была вялікая амерыканская мара: уласны дом у прыгарадзе, аўтамабіль і доступ да культурных імпрэз. Ультрапоспех — гэта пентхаус у цэнтры горада, тры аўтамабілі, адзін з якіх спартыўны, яхта і самалёт. Такі дакладны крытэрый поспеху рана ці позна прыходзіць да крызісу. Сённяшні работнік працуе, як правіла, у сферы абслугоўвання альбо ў IT-сферы, гэта значыць, што ён увесь час камунікуе з людзьмі альбо глядзіць у манітор. Ці ўсцешыць яго дом з тэлевізарам? Нехта кажа, што новым крытэрыем з'яўляецца магчымасць вандраваць — працаваць на Балі і траціць грошы ў Нью-Ёрку. Ёсць трэці варыянт: моцныя перажыванні. Адказы на гэтыя пытанні дае толькі культура, адкрыцці ў тэатры, літаратуры, фэшн-індустрыі. І мы ў «Ок16» збіраемся іх шукаць.

***— Вы плануеце арыентавацца на мерапрыемствы, якія ўпішуцца не толькі ў беларускі кантэкст, але і сусветны...***

— Так, і сувязь павінна ісці ў два бакі — імпарт і экспарт. Раз на два месяцы са свету да нас пры дапамозе суполкі «Artemp» прыходзяць канцэрты сучаснай акадэмічнай музыкі з шырокай геаграфіяй музыкантаў і кампазітараў. Адбываюцца нават сусветныя прэм'еры. Гэта наш спосаб нанесці «Ок16» на карту аматараў культуры старэйшых пакаленняў і на карту замежных творцаў, таму што рэзананс ад гэтых канцэртаў у прафесійных колах свету куды большы, чым у мінскага масавага гледача. У той жа час сумесна з «Art corporation» мы ставім спектаклі, якія паказваюцца адборшчыкам і маюць магчымасць быць адабранымі на міжнародныя форумы. Больш за тое, на фестывалі «ТЭАРТ» плануецца прывабіць такія катэгорыі, як замежныя і беларускія пастаноўкі. Калі спачатку ён імкнуўся абараніць маладых, магчыма, не вельмі вопытных, аўтараў, то за два гады працы акселератара мы ўзмоцнім беларускіх пастаноўшчыкаў настолькі, што яны змогуць смела суседнічаць з Хайнэрам Гёбельсам у агульнай праграме. Калі гэта адбудзецца, беларускі тэатр актыўна пачне паказвацца ў свеце.

***— Вы сказалі, што рэзананс ад канцэртаў класічнай музыкі ў «Ок16» у свеце куды больш, чым у Мінску. Як вы гэта заўважаеце?***

— Па заяўках. Спачатку да нас звярталіся толькі беларусы, але ў арт-колах добра працуе сарафаннае радыё, пост у інтэрнэце менш эфектыўны, чым рэкамендацыя ў кулуарах. Гэты кулуарны працэс ідзе як адзін з вынікаў — хутка ў нас будзе сусветная прэм'ера шведскага сучаснага тэатра. Звяртаюцца і музыканты з акадэмічнага поля, маўляў, у нас ёсць цікавы твор, ва Усходняй Еўропе мы яго яшчэ не ігралі, давайце мы за свае грошы прыедзем з Нью-Ёрка і зробім канцэрт.

***— З тых, хто прыйдзе да вас з надзеяй на комплексную дапамогу, каго вы выберацe, а каго адсееце?***



Фота Мікалая Васільева з архіва «Ок16».

— Па-першае, гэта павінен быць праект, які па зразумелых прычынах не падыходзіць для незалежных пляцовак меншага памеру, нам важна не выпальваць поле вакол. Па-другое, ён павінен быць дастаткова ўніверсальным у сэнсе мовы і тэматыкі. Мы не супраць лакальных беларускіх ідэй, але мы ведаем, што для іх ёсць інфраструктура, а наша задача — пераадольваць межы. Па-трэцяе, хочацца бачыць патэнцыял да сінергіі паміж рознымі напрамкамі, якія мы развіваем: нам спадабаецца тэатр, што інтэгруецца з тэхналогіяй VR, выстаўка з цікавай эканамічнай мадэллю падтрымкі мастакоў, галерэйны праект з выкарыстаннем класічнай музыкі, карацей, розныя дзіўныя ўзаемадзеянні. Але ўсё папярэдняе можа перакрыць толькі адна ўмова — прызначанасць менавіта для нашага завода з высокімі столямі, старымі сцэнамі і жалезнымі бэлькамі. Калі праект можа гэты антураж асэнсаваць і пераўтварыць у творчы альбо адукацыйны акт, то, канешне, ён наш, таму што першапачаткова народжаны для гэтага месца.

**Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

■

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона

Открытое акционерное общество «Стекольный завод «Залесье» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже:

1. Недвижимого имущества и оборудования, расположенного по адресу: Минская область, Вилейский район, п. Партизанский, ул. Ломоносова, 10, в составе:

– Оборудование в количестве 29 ед. (лотов)

– Недвижимое имущество:

Лот № 30. Административно-бытовой корпус –1827,5 $м^2$;
Лот № 31. Склад огнеупоров – 348,5 $м^2$;
Лот № 32. Склад огнеупоров – 502,7 $м^2$;
Лот № 33. Гончарный цех – 88,6 $м^2$;
Лот № 34. Склад материалов – 503 $м^2$;

2. Недвижимого имущества, расположенного по адресу: Минская область, Молодечненский район, д. Красное, ул. Привокзальная, 42, в составе: Лот № 35 – котельная – 106,3 $м^2$;
Лот № 36. Насосная – 20,1 $м^2$;
Лот № 37. Мазутная – 48,1 $м^2$;
Лот № 38. Склад-модуль – 926,3 $м^2$;
Лот № 39. Склад готовой продукции – 666,4 $м^2$;
Лот № 40. Железнодорожная ветка; повышенный путь.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах, а также подробная информация об имуществе, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайтах:

1) www.minsk-region.gov.by в разделе Работа с инвесторами «Одно окно» (Раздел 5. Аукционы по продаже недвижимости).

2) www.molodechno.minsk-region.by/ru/economy/aukcion в разделе «Аукцион».

3) www.vileyka.minsk-region.by.

4) www.peramoga.by.

Аукцион состоится **28.02.2018** в 11.00 по адресу: Минская обл., г. Вилейка, ул. 17 Сентября, д. 32. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.02.2018** в рабочие дни до 15.00 по указанному адресу.
Тел.: +375 29 6853677 УНП 600010636

## Извещение о проведении очередного (годового) общего собрания акционеров общества ОАО «Амкодор-КЭЗ» Витебская обл., Толочинский район, г. п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3

Собрание состоится **28 марта 2018 г. в 14.00** по адресу: Витебская обл., Толочинский район, г. п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3, зал заседаний Общества.

Орган, созывающий собрание: Совет директоров ОАО «Амкодор-КЭЗ».

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 13.00 до 13.55.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия. При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (договором) (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим статус руководителя).

Повестка дня:

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2017 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2018 год.
2. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2017 год.
3. Утверждение распределения и использования прибыли (убытков) за 2017 год.
4. Утверждение направлений распределения прибыли на 2018 год.
5. Избрание членов Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.
6. Утверждение размера вознаграждения членам Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.

Лица, имеющие право на участие в собрании, имеют право ознакомиться с информацией о деятельности общества за отчетный период, начиная с 7 марта 2018 года, а с иной информацией (документами), подлежащими представлению при подготовке к проведению собрания, начиная с 21 марта 2017 года ежедневно (кроме субботы и воскресенья) в отделе кадров ОАО «Амкодор-КЭЗ» (Витебская обл., Толочинский район, г. п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3 с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Совет директоров ОАО «Амкодор-КЭЗ»

УНП 300028841

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор торгов:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.

**Продавец:** общество с ограниченной ответственностью «Полоцкая строительная компания», 211400, Витебская обл., г. Полоцк, ул. Суворова, д. 64, тел. 8 (029) 219-07-93

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 250/С-43103 площадью 1039 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Полоцкий район, г. Полоцк, ул. Суворова, 64, наименование – стоянка автотранспортная, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, на земельном участке с кадастровым номером 243500000005002005 площадью 0,1519 га. Составные части и принадлежности: стоянка автотранспортная. Начальная цена: 8 368 руб. без НДС. Задаток: 836,80 руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 06.03.2018 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах с 19.02.2018 с 8.30 по 03.03.2018 до 17.30. **Условие аукциона:** НДС сверх цены продажи имущества не уплачивается. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 04.05.2017, 17.06.2017, 12.08.2017, 16.08.2017, 28.10.2017, 14.12.2017, 20.01.2018

Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Сумма задатков перечисляется** на р/с BY55BAPB30124514600120000000 в ОАО «Белагропромбанк» Витебское областное управление г. Витебск, БИК BAPBBY22424, УНП 390455266. Получатель платежа: ООО «Полоцкая строительная компания». Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. Шаг аукциона – 5 % начальной цены предмета торгов. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 дней со дня проведения торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Контактные тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

## Острошицкий сельский исполнительный комитет (организатор аукциона) извещает о проведении 21 марта 2018 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Ограничения в использовании, инфраструктура | Начальная цена (бел. руб.) | Размер задатка (бел. руб.) | Расходы по изготовлению документации (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | аг. Острошицы, ул. Зеленая, 7. Кадастровый номер 623286306601000485 | 0,1145 | Новый район индивидуальной застройки. Имеются сети: электрификация, водоснабжение, (возможность газификации) | 10 000,00 | 1000,00 | 315,93 (восстановление границ) |
| 2 | д. Чуденичи, ул. Цветочная, 1. Кадастровый номер 623286308101000484 | 0,1500 | Новый район индивидуальной застройки. Имеются сети: электрификация, водоснабжение, газификация | 12 000,00 | 1200,00 | 1901,32 |

**Дата, время и место проведения аукциона**: 21 марта 2018 в 10.00 по адресу: Логойский район, аг. Острошицы, ул. Центральная, д. 8, Острошицкий сельский исполнительный комитет.

**Прием документов, ознакомление с участком и документацией:** ежедневно с 8.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 15.03.2018 включительно; к заявлению прилагается квитанция об оплате задатка и копия личного паспорта.

**Задаток** перечисляется на расчетный счет BY37AKBB36006191411050000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНН 600537220, код платежа 04901, получатель – Острошицкий сельский исполнительный комитет.

**Условия:** победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

**Конт. тел.: (801774) 57 6 21, 57 6 35, 57 6 36; (+375 29) 6444886**

## Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды земельного участка

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, тел. (0212) 472056.

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды |
|---|
| Лот № 1. Право заключения договора аренды сроком на 25 лет земельного участка с кадастровым №223350100001002416 площадью 0,0325 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, г. Миоры, ул. Вокзальная, 1В для размещения и обслуживания автомойки. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена**: 1 062,57 руб. **Задаток:** 106,26 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY94AKBB36003210000000000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04002. Получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 20.03.2018 в 15.30 по адресу: Витебская обл., г. Миоры, ул. Дзержинского, 17 в Миорском районном исполнительном комитете. Срок внесения задатков и приема документов: с 19.02.2018 с 8.30 по 19.03.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в рабочие дни с 8.30 до 17.30 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия аукциона:** заключить договор аренды с Миорским районным исполнительным комитетом и в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды зем. участка и после получения настоящего решения и протокола о результатах аукциона осуществить гос. регистрацию права аренды и договора аренды зем. участка; приступить к занятию данного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления в течение 6 месяцев юр. лицо, ИП, а гражданин в течение одного года, со дня получения свидетельства (удостоверения) о гос. регистрации зем. участка и возникновения права на него; в месячный срок после получения настоящего решения получить в отделе архитектуры и строительства райисполкома архитектурно-планировочное задание и тех. условия на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства; разработать и утвердить в установленном порядке ПСД; приступить к строительству объекта после разработки и утверждения в установленном порядке строительного проекта и получения разрешения на производство строительно-монтажных работ; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД. Назначение зем.участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 16 04 – зем. участок для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей (в том числе автомобильных заправочных и газонаполнительных станций) |

Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. **Победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан (условия аукциона):** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся: внести плату за право заключения договора аренды зем. участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением документации, необходимой для его проведения. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц). Для участия в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/с, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by

## 20 марта 2018 г. ИЗВЕЩЕНИЕ №3-А/2018
## о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды, (лет) | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку докум-ции, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | По ул. Оськина | 340100000007072556 | 0,0727 | Для строительства и обслуживания здания розничной торговли | Охранная зона сетей сооружений канализации, электрических сетей, объектов газораспределительной системы | 5 | 5 718,33 | 300,00 | 3 407,18 |
| 2 | Район индивидуальной жилой застройки «Красный Маяк» (участок № 106 по генплану) | 340100000008001957 | 0,0861 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Охранная зона сетей и сооружений канализации | 99 | 6 337,19 | 200,00 | 1 927,36 |
| 3 | Район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 170 по генплану) | 340100000008002780 | 0,0840 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Охранная зона линий связи и радиофикации | 99 | 5 716,01 | 200,00 | 1 828,79 |
| 4 | По ул. Объездной, 1 | 340100000005007267 | 2,8215 | Для строительства и обслуживания объекта производственного назначения | Ограничений в использовании нет | 5 | 87 024,79 | 4 500,00 | 4 520,36 |

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).

2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3–6)

3. **Аукцион состоится 21 марта 2018 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении, с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY23912. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах).

Необходимые документы: 4.1 граждане – копию документа, содержащего их идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.3 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

4.6 представители иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность и его копию.

5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 17 февраля по 19 марта 2018 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3–6**

**Контактный телефон: 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.qomel.qov.by либо geodezcentr.by**

# КАЛІ І Ў КАГО РАГОЎ МНОГА,

## ці Як «запалкі» пераўтвараюцца ў «рыдлёўкі»

**Мецъ у якасці адмысловага паляўнічага трафея рогі дзікіх жывёл мараць многія паляўнічыя. Ды і не толькі ў іх яны карыстаюцца попытам. Напрыклад, майстры цэняць рогі ў якасці матэрыялу для выразання розных вырабаў. Сёння спецыялісты Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь увядуць чытачоў у гэтую тэму.**

У дзікай прыродзе Беларусі жыве некалькі прадстаўнікоў сямейства аленевых — лось, высакародны алень, еўрапейская казуля і ў нязначнай колькасці еўрапейская лань.

Аленевыя маюць галінастыя касцяныя рогі, якія ўтвараюцца на вырастах лобных костак і штогод змяняюцца. Звычайна яны ёсць толькі ў самцоў, хоць у паўночных аленяў імі ўзброены і самкі, а вадзяныя алені (насяляюць усходні Кітай і Карэйскі паўвостраў) пазбаўлены іх.

У адрозненне ад пустарогіх (каровы, бізоны, дзікія казлы і бараны) рогі аленяў валодаюць ячэістай структурай. Падчас росту яны пакрытыя пяшчотнай і адчувальнай скурай з вялікай колькасцю крываносных сасудаў, якія сілкуюць рагавую костку і садзейнічаюць яе ўмацаванню. Асноўнае прызначэнне рагоў — выкарыстанне ў шлюбных паядынках у перыяд спароўвання, а таксама як сродак абароны ад драпежнікаў. Паўночныя алені выкарыстоўваюць рогі для расчысткі снегу, каб дабрацца да асноўнага іх корму — ягелю.

Рогі ў самцоў-сяголеткаў лася пачынаюць расці ў верасні-кастрычніку. У студзені-лютым яны маюць выгляд шышак, а ў сакавіку дасягаюць некалькіх сантыметраў. Цалкам сфарміраваныя рогі ў выглядзе прутка даўжынёй каля 5—30 сантыметраў або з двума невялікімі адросткамі цвярдзеюць у канцы ліпеня — пачатку жніўня. Скідаюць іх жывёлы параўнальна позна — у сакавіку і красавіку наступнага года. Новыя, часцей двух- або трохканцовых, растуць хутка, ачышчаючца ад скуры ў другой палове верасня і скідаюцца ў перыяд са снежня да сакавіка.

Дарослыя самцы ласея губляюць рогі звычайна з сярэдзіны лістапада да студзеня, прыкладна палова жывёл губляе іх ужо да сярэдзіны снежня. Рост новых шматканцовых пачынаецца ў лютым-сакавіку, ачышчэнне ад аксаміту завяршаецца ў жніўні — пачатку верасня. Памер рагоў і колькасць адросткаў на іх павялічваецца з узростам да пэўнай мяжы і ў значнай меры суадносіцца з масай жывёл. Найбольш развітыя рогі ў самцоў ва ўзросце 6—10 гадоў. Аднак па памерах і колькасці адросткаў нельга адназначна меркаваць пра ўзрост жывёл, паколькі ступень развіцця рагоў залежыць таксама і ад фізіялагічнага стану звяроў.



У цялят-самцоў высакароднага аленя зачаткі рагоў прыкметныя з верасня, але іх інтэнсіўны рост пачынаецца з сакавіка-красавіка, да верасня-кастрычніка рогі-«шпількі» або з адным адгалінаваннем адрастаюць да 30—60 сантыментаў і касцянеюць. Другія рогі з надвочным і сярэднім адросткамі развіваюцца на трэцім годзе жыцця.

З узростам рогі высакароднага аленя падаўжаюцца і становяцца больш масіўныя. Поўнага развіцця яны дасягаюць да 5-6, максімальнага — да 10—12 гадоў жыцця жывёл. Пазней выяўляюцца прыкметы дэградацыі: у першую чаргу знікае другі надвочны адростак, затым і астатнія, аж да таго, што застаецца толькі першы надвочны, губляецца сіметрычнасць рагоў, памяншаюцца іх памер і маса.

Скіданне рагоў у дарослага высакароднага аленя адбываецца з канца лютага — пачатку сакавіка да сярэдзіны мая. Здаровыя і ўкормленыя асобіны губляюць іх раней, а моцна знясіленыя і аслабленыя цяжкай зімоўкай, хворыя і маладыя пазней: у канцы красавіка — маі. Неўзабаве пасля гэтага пачынаюць расці панты, рост новых рагоў заканчваецца ў канцы чэрвеня — першай палове ліпеня. У другой палове ліпеня — у жніўні жывёлы чысцяць іх трэннем аб дрэвы. Працэс фарміравання рагоў займае 90—115 дзён, акасцяненне — каля 30—40 дзён, ачыстка скуры — больш за тыдзень.

Першыя пакрытыя скурай рожкі еўрапейскай казулі пачынаюць расці ў цялят-самцоў са жніўня, у верасні — лістападзе яны могуць дасягаць 0,5-5 сантыметраў, да мая-чэрвеня вырастаюць да 6—24 сантыметраў і касцянеюць. Першыя рогі, як правіла, не маюць адросткаў ці ж зрэдку разгаліноўваюцца на самым канцы. Але ў нешматлікіх добра развітых сяголеткаў яны ўжо да снежня вырастаюць да 6—12 сантыметраў, касцянеюць і скідаюцца ў самым канцы снежня або ў студзені. У такіх асобін з лютага развіваюцца другія, звычайна двух- або трохадросткавыя, рогі. Гадавалыя самцы еўрапейскай казулі чысцяць іх ад скуры ў маі, на адзін-тры месяцы пазней за дарослых. Скідаюць рогі часцей у снежні. У канцы студзеня — лютым пачынаецца рост новых, параўнальна тонкіх двух- або трохканцовых, якія ачышчаюцца ад аксаміту ў канцы мая — чэрвені, на два-чатыры тыдні пазней, чым у дарослых. З трэцяга года жыцця скідванне рагоў адбываецца з канца кастрычніка да сярэдзіны снежня.

Цыкл развіцця рагоў у лані рэгулюецца палавымі гармонамі. Першыя маленькія рожкі-«запалкі» з'яўляюцца паміж 5 і 12 месяцамі жыцця і спачатку нагадваюць доўгія вырасты на лбе. Даўжыня такіх вострых рожкаў часам дасягае 20 сантыметраў. У трох-чатырохгадовых самцоў адрастаюць характэрныя для гэтага віду рогі-«рыдлёўкі». На галоўным ствале кожнага рога маецца не менш за тры адросткі, накіраваныя ў бок «рыдлёўкі». Вертыкальна пастаўленая «рыдлёўка» абрамлена па заднім краі так званым грэбнем пеўня і заканчваецца «шпорай». Штогод у красавіку — чэрвені дарослы самец скідае старыя рогі, замест якіх у жніўні-верасні адрастаюць новыя.

У Законе Рэспублікі Беларусь «Аб жывёльным свеце», Правілах вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання і іншых актах заканадаўства аб ахове і выкарыстанні жывёльнага свету не ўстаноўлена забаронаў або абмежаванняў на ажыццяўленне грамадзянамі збіральніцтва скінутых рагоў дзікіх капытных жывёл (аленевых), якія жывуць на ўмовах натуральнай свабоды. Яны не адносяцца да прадукцыі палявання і паляўнічых трафеяў, паколькі не з'яўляюцца часткамі загінулых або здабытых дзікіх жывёл.

Аднак варта памятаць: не дапускаецца самавольнае знаходжанне грамадзян на тэрыторыі запаведнікаў — Бярэзінскага біясфернага і Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага — і запаведных зон асабліва ахоўных прыродных тэрыторый, а таксама на тэрыторыях, што падвергліся радыеактыўнаму забруджванню і на якіх устаноўлены кантрольна-прапускны рэжым.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ А не шкодзь!

## Паквапіўся на ўпрыгажэнне муфлона

**Летась суд Верхнядзвінскага раёна вынес прысуд бацьку і сыну з пасёлка Асвея, якіх прызналі вінаватымі ў браканьерстве.**

У пачатку чэрвеня пазамінулага года сваякоў затрымалі з сеткамі на возеры Асвейскім. Паколькі ў той час у Віцебскай вобласці яшчэ дзейнічала нераставая забарона, улоў абышоўся парушальнікам вельмі дорага: сума пакрыцця нанесенай шкоды, якую трэба будзе выплаціць браканьерам, складае больш за 15 тысяч рублёў.

Падчас гэтага ж судовага разбору разглядалася яшчэ адно парушэнне, здзейсненае малодшым з падсудных. Мужчына скраў з вальера мясцовай паляўнічай гаспадаркі галаву загінулага муфлона. Рэдкая жывёла, хутчэй за ўсё, была забіта ў сутычцы з іншымі асобінамі. Парушальнік упадабаў рогі: пралез за агароджу вальеры, разабраў тушу і хацеў знікнуць з месца, але быў затрыманы. Па факце крадзяжу суд прызначыў мужчыну адзін год пазбаўлення волі, а за незаконнае рыбалоўства ён з бацькам былі прыгавораны да паўтара года пазбаўлення волі ўмоўна з выплатай 840 рублёў штрафу і пакрыццём шкоды ■

■ На слыху

## Трагедыя на трасе

### «Аўдзі» сутыкнулася з ласём: загінула 18-гадовая дзяўчына, яе брат і бацька — у рэанімацыі

**Трагедыя адбылася каля 21 гадзіны 15 лютага паблізу вёскі Пескі Мастоўскага раёна. Сігнал атрымалі па тэлефоне адзінай дыспетчарскай службы супрацоўнікі МНС.**

Як паведаміла **інспектар аддзела агітацыі і грамадскіх сувязяў ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама Людміла РАКЕВІЧ**, аўтамабіль «Аўдзі» сутыкнуўся на трасе з ласём, пасля чаго вылецеў у кювет і там урэзаўся ў дрэва. У выніку аварыі пасажыры аказаліся заблакаванымі ў салоне. Ратавальнікам давялося літаральна выразаць з пакарабачанай машыны 42-гадовага вадзіцеля і яго 13-гадовага сына, які ехаў на пярэднім сядзенні. А вось 18-гадовая дачка, якая сядзела ззаду, загінула на месцы.

Па папярэдняй інфармацыі, бацька з сынам ездзілі ў суседні рэгіён, каб забраць дамоў першакурсніцу аднаго з каледжаў. Вечарам яны вярталіся назад, і на трасе Шчучын—Ваўкавыск адбыўся наезд на ласяя, які раптоўна выйшаў на дарогу.

Як стала вядома, мужчыну, які атрымаў найбольш цяжкія раны, перавязуць у Гродзенскую абласную бальніцу хуткай дапамогі. Для гэтай мэты выкліканы спецыяльны рэанімабіль. Па словах медыкаў, яго стан ацэньваецца як стабільна цяжкі, мужчына знаходзіцца ў прытомнасці. У першую чаргу ён пройдзе абследаванне на камп'ютарным тамографе. Магчыма, для кансультацый будуць падключаны сталічныя спецыялісты.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

## Перайшлі граніцу, каб папаляваць

**У паляўнічых угоддзях Краснапольскага раёна работнікі Касцюковіцкай міжраённай інспекцыі і мясцовы егер затрымалі двух расіян.**

Мужчыны, якія пражываюць у сяле Гардзееўка Бранскай вобласці, перайшлі граніцу, каб ноччу папаляваць. Але здабыць звера не паспелі, а сустрэўшы рэйдавую групу, паспрабавалі збегчы. Адзін з парушальнікаў быў узброены карабінам, які на хаду кінуў у хмызняк. Пасля затрыманы сцвярджаў, што не здагадваўся аб знаходжанні на беларускай тэрыторыі, хоць яго хаўруснік сцвярджаў адваротнае.

Абодвух парушальнікаў прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці за нелегальнае паляванне, а ў адносінах да ўладальніка карабіна заведзена яшчэ і крымінальная справа за незаконныя дзеянні з нарэзной зброяй і боепрыпасамі да яе. Аўтамабіль, на якім прыехалі паляўнічыя, таксама знаходзіцца пад арыштам ■

■ Май на ўвазе!

## Праверацъ і колькасць кручкоў, і чысціню

**Прафілактычная акцыя па кантролі за выкананнем правілаў рыбалоўства «Рыбалка па правілах» праходзіць у Беларусі. Яна будзе доўжыцца да 18 лютага.**

Работнікі Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў разам з інспектарамі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь арганізавалі ўзмоцнены кантроль за выкананнем Правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства і найперш — у часцы лоўлі рыбы зімнімі жарліцамі і падтрыманнем рыбаловамі належнага санітарнага стану рыбалоўных угоддзяў. На вадаёмах краіны падчас акцыі будуць праводзіцца рэгулярныя прафілактычныя рэйдавыя мерапрыемствы.

Варта нагадаць, што дазваляецца выкарыстоўваць прылады рыбалоўства аднаго ці розных відаў з агульнай колькасцю кручкоў не больш за пяць штук на рыбалова. Выключэнне складаюць члены Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў, якім дазваляецца выкарыстоўваць да дзесяці кручкоў на рыбалова. Парушэнне патрабавання цягне адміністрацыйную, крымінальную ці іншую адказнасць у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■

# ПРЫВІТАННЕ АД ЖОЎТАГА САБАКІ

## Настаў 4716 год па кітайскім календары

**У Паднябеснай сустрэлі Новы год па месяцовым календары, або Свята вясны (Чуньцзэ). Яго таксама адзначаюць у шэрагу іншых краін і тэрыторый, дзе пражывае значная колькасць кітайцаў, перш за ўсё ў дзяржавах Усходняй Азіі. У Кітаі з нагоды Чуньцзэ распачаліся вялікія святочныя вакацыі, падчас якіх 385 мільёнаў кітайцаў здзейсняць турпаездкі. Прынамсі, такі прагноз зрабілі сумесна Кітайская акадэмія турызму, Цэнтр даных пры Дзяржаўным упраўленні па справах турызму і турыстычнае анлайн-агенцтва Ctrip, паведаміла інфармагенцтва «Сіньхуа». Цэпер кітайцы актыўна перамяшчаюцца ўнутры Паднябеснай, каб абавязкова сустрэць галоўнае свята разам з сям'ёй. Чаго чакаць ад Жоўтага Сабакі?**






### ПРЫВАБІЦЬ ДАБРАБЫТ

Кітайскі новы год пачынаецца ў першы дзень першага месяца па кітайскім месяцова-сонечным календары, які склаўся ў эпоху дынастыі Хань (II стагоддзе да н. э. — II стагоддзе н. э.). Свята прыпадае на адзін з дзён паміж 21 студзеня і 21 лютага. Напрыклад, сёлета новы 4716 год па кітайскім календары пачаўся 16 лютага. Урачыстасць таксама называюць «месяцовым Новым годам», паколькі яго дакладная дата разлічваецца на аснове месяцовых фаз. Свята існуе, па прыкідках гісторыкаў, ледзь не з часоў трох першых кітайскіх дынастыйных перыядаў — Ся, Шан і Чжоў. Калі гэта так, то звычаю ўжо каля трох-чатырох тысяч гадоў, адзначае ТАСС.

У Кітаі Свята вясны захавала сімвалізм і традыцыйнасць, нягледзячы на пэўныя рэгіянальныя адрозненні ў звычаях і традыцыях. Звычайна кітайцы трацяць свае грошы на абноўкі — купляюць падарункі, упрыгажэнні, прадукты харчавання і адзенне. Акрамя таго, кожная сям'я старанна прыбірае жыллё, лічачы, што такім чынам яны чысцяць сваё жыццё ад любых няўдач і вызваляюць месца для шчасця.

Да святочнай вячэры нават тыя сямейнікі, якія працуюць або вучацца ў іншых гарадах, вяртаюцца дадому, частуюцца рознымі прысмакамі (самыя распаўсюджаныя — стравы са свініны, качкі, курыцы і шматлікія віды ласункаў і кандытарскіх вырабаў, у тым ліку рысавае печыва няньгаа). Па традыцыі напярэдадні Новага года гаспадыні гатуюць стравы з рыбы. Па-кітайску рыба — «юй» — сугучная з іерогліфам, які азначае дабрабыт. Яшчэ адна абавязковая страва на стале — пельмені «цзяацзы». Кітайцы іх лепяць усёй сям'ёй яшчэ да наступлення свята. Пельмень сваёй формай нагадвае сярэбраны злітак, ляпіць іх разам азначае «разам рабіць грошы». Існуюць і іншыя кулінарныя хітрыкі, прыкладам дэсерт у форме рыбы з клейкага рысу «нянь», што па сугучнасці азначае «багацець з году ў год».

### ЯК СПУЖАЦЬ НЯНЮ?

З Чуньцзэ звязана мноства легендаў. Адна з самых вядомых — гісторыя пра чароўную марскую пачвару Нянь, якая выходзіла на зямлю ў першы дзень года. Кажуць, што гэтая істота была настолькі галодная і злосная, што змятала ўсё на сваім шляху — знішчала запасы, руйнавала паселішчы і нават... ласавалася дзецьмі, якія на працягу года паводзілі сябе неналежным чынам. Жыхары вёсак неадночы пакідалі свае дамы і сыходзілі ў лес у надзеі схавацца ад пачвары, пакуль не заўважылі, што Нянь апасаецца гучных прамоў, вясёлай мітусні і чырвонага колеру.

**Сімвал 2018-га — зямля, колер, адпаведна, жоўты. Як спрадвеку мяркуюць жыхары Паднябеснай, такое спалучэнне сімвалізуе вернасць, бескарыслівасць, адданасць, прыязнасць і сумленнасць, а значыць, гэты год будзе вылучацца мірам, стабільнасцю і гармоніяй.**

З таго часу напярэдадні Новага года кітайцы ўпрыгожваюць сваё жыллё і вуліцы паселішчаў яркачырвонымі палотнішчамі «чуньлянь» з каліграфічна выпісанымі залатымі іерогліфамі — пажаданнямі шчасця і ўдачы, развешваюць гірлянды з яркіх ліхтарыкаў, запускаюць феерверкі і «страляюць»



хлапушкамі. Нягледзячы на тое, што старажытная міфічная пачвара больш не пагражае жыхарам Паднябеснай, яны дагэтуль захавалі сваю любоў да грукату і бляску навагодніх петардаў.

Аднак дзеля «падтрымання добрай экалогіі і спакою гараджан» улады з году ў год робяць больш жорсткай забарону на «вогненныя пацехі». У Пекіне, напрыклад, прынята пастанова: напярэдадні і ў перыяд свят забаронены гандаль піратэхнічнымі вырабамі, іх транспарціроўка і выкарыстанне. Усім чыноўнікам строга загадана «ўстрымацца ад запуску феерверкаў, падаючы станоўчы прыклад усім іншым грамадзянам». Падобныя абмежаванні дзейнічаюць і ў Шанхаі. Там продаж і запуск феерверкаў дазволены ў спецыяльна адведзеных месцах, а кожны пакупнік абавязаны прад'явіць дакумент і пакідаць свае асабістыя даныя пры набыцці піратэхнічнай прадукцыі.

### ПАДАРУНАК У СЕЦІВЕ

Жыхары Паднябеснай, мабыць, самыя актыўныя карыстальнікі «сусветнага павуціння» ў свеце, таму ўсё часцей лічаць за лепшае віншаваць сяброў і блізкіх анлайн. Адзін з самых папулярных спосабаў — адпраўка «стыкера» — анімаванай карцінкі. Часцяком карыстальнікі сумяшчаюць традыцыйныя пажаданні — кітайскія ідыёмы (чэн'юй) — з пацешнымі малюнкамі або фатаграфіямі знакамітасцяў. Напрыклад, напярэдадні года Жоўтага Землянога Сабакі найбольшую папулярнасць набылі жоўты лабрадор з бліскучымі іерогліфамі вакол морды, а таксама чыхуахуа з пачкам юаняў у пярэдніх лапах — абноўлены сімвал дастатку і матэрыяльнага дабрабыту.

Паступова сеціва ўбірае ў сябе і іншыя традыцыі: калісьці ў навагоднюю ноч дзеці атрымлівалі ад старэйшых сямейнікаў так званыя хунбаа — чырвоныя скруткі з манеткамі ўнутры на поспех, потым іх змянілі «шчаслівыя канверты» з банкнотамі. Сёння ўсё больш кітайцаў аддаюць перавагу пераводу грошай з дапамогай смартфона: у месенджары WeChat («Вічат») існуе спецыяльная функцыя — адпраўка чырвонага канверта «хунбаа» анлайн.

### МАХНУЦЬ У АНТАРКТЫДУ

Народныя гулянні Чуньцзэ — гэта не толькі пышныя застоллі. Паводле афіцыйных даных, больш за 6,5 мільёна грамадзян КНР забраніравалі замежныя туры на перыяд вялікіх навагодніх выхадных.

Найбольш папулярнымі напрамкамі з'яўляюцца Тайланд, Японія, Сінгапур, В'етнам, ААЭ і краіны Еўропы. Экстрэмалы маюць магчымасць сустрэць Новы год у Антарктыдзе або Арктыцы.

Для аматараў больш спакойнага баўлення часу CCTV (Цэнтральнае кітайскае тэлебачанне) падрыхтавала насычаную праграму: удзельнікі навагодніх шоу — майстры гумарыстычнага дыялогу «сяншэн», выканаўцы твораў фальклору, спевакі, танцоры і музыканты — будуць забаўляць жыхароў Кітая на працягу двух тыдняў. Увогуле святкаванне працягнецца да 2 сакавіка. У гэты дзень па месяцовым календары сёлета адзначаць Свята ліхтароў — Юаньсяацзэ. Тысячы ліхтарыкаў чырвонага колеру паднімуцца ў неба над гарадамі і вёскамі Кітая, а сем'і збяруцца на ўрачыстую вячэру з «цзяацзы», з клейкім салодкім рысам і мандарынамі — салодкімі аранжавымі «ліхтарыкамі». Паводле падання, на 15-ы дзень новага года за сталом сустракаюцца не толькі жывыя сваякі, але і духі нябожчыкаў-продкаў, каб разам са сваімі блізкімі падзяліць радасць прыходу вясны.

### ТРЫ БІТВЫ

Старшыня КНР Сі Цзіньпін, выступаючы напярэдадні перад членамі Усекітайскай федэрацыі прамысловасці і гандлю, паведаміў, што ў 2018 годзе самымі важнымі будуць «тры бітвы: прадухіленне ўзнікнення фінансавых рызык, скарачэнне ўзроўню беднасці і барацьба з забруджваннем навакольнага асяроддзя». Адразу пасля навагодніх свят у органах улады КНР адбудуцца важныя змены. На дзвюх сесіях — Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў (УСНП) і Усекітайскага камітэта Народнага палітычнага кансультацыйнага савета Кітая (УК НПКСК) — будуць абраныя старшыні Пастаяннага камітэта УСНП і УК НПКСК. Сесія найвышэйшага заканадаўчага органа (УСНП) адкрыецца 5 сакавіка. Чакаецца, што на ёй Сі Цзіньпін будзе пераабраны старшынёй КНР на яшчэ адзін пяцігадовы тэрмін, а Лі Кэцян — прэм'ерам Дзяржсавета, перадае ТАСС. Акрамя таго, мяркуецца стварэнне новага органа — Дзяржаўнай наглядной камісіі. Яна будзе курыраваць антыкарупцыйную работу ў Кітаі.

Сімвал 2018-га — зямля, колер, адпаведна, жоўты. Як спрадвеку мяркуюць жыхары Паднябеснай, такое спалучэнне сімвалізуе вернасць, бескарыслівасць, адданасць, прыязнасць і сумленнасць, а значыць, гэты год будзе вылучацца мірам, стабільнасцю і гармоніяй. Астролагі наперабой прадказваюць, што сёлета сціхнуць канфлікты, якія існуюць у свеце, палепшыцца эканамічнае становішча і павысіцца якасць жыцця людзей. Прынамсі, Жоўты Сабака гэта абяцае.

**Захар БУРАК.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА: — У тэму

## Спадзяюся, што ў беларуска-кітайскіх адносінах заўсёды будзе панаваць вясна

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Старшыню КНР Сі Цзіньпіна і дружалюбны кітайскі народ са Святам вясны, паведамілі газеце «Звязда» ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў мінулым, юбілейным для беларуска-кітайскіх адносін, годзе ўдалося пашырыць узаемадзеянне па ўсіх напрамках, усталяваць яшчэ больш цесныя сувязі паміж рэгіёнамі і ведамствамі дзвюх краін.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што 2018 год стане важнай вехай у развіцці двухбаковага супрацоўніцтва. Паглыбленню ўзаемаразумення паміж грамадзянамі дзвюх дзяржаў, іх культурнаму збліжэнню будуць спрыяць мерапрыемствы ў рамках Года турызму Беларусі ў Кітаі.

«Мы заўсёды гатовыя да нарошчвання ўсебаковага стратэгічнага партнёрства з Кітаем, якое вылучаецца даверным і ўзаемавыгадным характарам. Шчыра спадзяюся, што ў беларуска-кітайскіх адносінах заўсёды будзе панаваць вясна і наша сяброўства будзе мацнець з кожным днём», — падкрэсліў Прэзідэнт.



■ Гардэроб

# ЯРКА, ЗРУЧНА, ІРАНІЧНА

## ГАЛОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ ГЭТАЙ ВЯСНЫ

**Ці прыйдзе сапраўдная вясна ў сакавіку, невядома, але нішто не перашкаджае пачаць новы модны сезон па календары. Падказваем, да чаго прыглядзецца ў крамах і якім рэчам з вашай шафы можна даць другое жыццё.**

### Ультрафіялет


Самы модны колер вясны.

Галоўны колер гэтай вясны. На думку прадстаўнікоў Інстытута колеру Pantone, ён сімвалізуе арыгінальнасць, наватарства і будучыню з яе новымі тэхналогіямі і палётамі ў іншыя галактыкі. А яшчэ можа быць крыніцай натхнення для творчасці. Іншае пытанне, як удала ўключыць яго ў свой гардэроб, бо колер дляноскі дастаткова складаны. Ён добра спалучаецца з жоўтым і каралавым (варыянт для тых, хто хоча выглядаць ярка), а таксама з бэжавым, белым і чорным (больш спакойны вобраз). Калі не ўпэўнены, што ўльтрафіялет вам пасуе, выберыце аксесуар гэтага адцення ці спадніцу, а не блузку: так колер будзе знаходзіцца далей ад твару і не надасць яму стомлены выгляд. Зусім не падабаецца? Тады прыглядзьцеся да іншых модных у гэтым сезоне колераў — яркага жоўтага, шакаладнага, халоднага зялёнага, тонаў «памідор чэры» і «ружовая лаванда».

### Плашчы на любы густ

Калі ў вашай шафе няма трэнча (двухбортнага дажджавога плашча з поясам), ёсць добрая нагода яго купіць. Беспройгрышны варыянт — аб'ёмны бэжавы даўжынёй па калена. Трэнч спалучаецца і са строгімі нагавіцамі, ствараючы дзелавы вобраз, і з паўсядзённымі джынсамі. А яшчэ дызайнеры прапануюць звярнуць увагу на чырвонага скуранога плашча. Насіце яго з гольфам і спадніцай спакойных адценняў, каб збавіць градус экстравагантнасці.

### Даўгія махры

Імі могуць быць дэкарыраваныя спадніца, сукенка, кашуля і нават паліто. У модзе — цяжкія, пушыстыя і шматслойныя махры. Спадніца з такім аздабленнем добра будзе глядзецца ў камплекце са світарам буйной вязкі. А куртка — з джынсамі і грубым абуткам. У першым выпадку атрымаем рамантычны вобраз, у другім — смелы і бунтарскі. Асноўнае правіла пры носцы махроў: астатнія рэчы на вас мусяць быць максімальна простымі і лаканічнымі. І памятайце, што такі дэкор дадае фігуры аб'ёму.

### Пластык

Звычайна дызайнеры аддаюць перавагу натуральным тканінам. Але бываюць выключэнні. Для нашага дажджлівага надвор'я рэчы з пластыку — тое, што трэба. У наступным сезоне гэты матэрыял будуць выкарыстоўваць і пры вырабе абутку, і пры пашыве адзення. Наколькі ў гэтым камфортна — пытанне адкрытае. Але плюсы адназначна ёсць. Так, празрысты пластыкавы плашч дазволіць прадэманстраваць адзенне пад ім не толькі ў памяшканні, але і на вуліцы. А ў сумцы з такога матэрыялу нішто не зможа згубіцца.

### Паеткі

Хочаце, каб ваша з'яўленне на вячэровым мерапрыемстве было бліскучым? Выбірайце сукенку ў паетках. Яшчэ нядаўна такі дэкор лічыўся безгустоўнасцю, а гэтай вясной — зноў на піку моды. Каб паеткі былі дарэчы ўдзень, спалучайце гэтыя аксесуары з грубымі чаравікамі, звычайнымі трыкатажнымі вадалазкамі, джынсамі. Хоць прыкоўваць увагу будзеце ў любым выпадку.

### Сумкі на пояс


Паясныя сумкі — гэта як мінімум зручна.

Той момант, калі гандляры на рынку і турысты на экскурсіі нечакана трапілі ў трэнд. Зрэшты, так сапраўды больш зручна. Па форме модныя паясныя сумкі розныя: спартыўныя, падобныя да касметычак, звычайныя міні-мадэлі, якія дагэтуль насілі цераз плячо. Моцным аргументам у абарону новай тэндэнцыі можа стаць тое, што такія аксесуары мільгалі на паказах Gucci і Valentino.

### Мінімалізм

Простыя сілуэты, адзіндва колеры ў вобразе, адсутнасць дэкору. У цэнтры ўвагі — крой рэчаў і вы самі. Прымерайце такі варыянт: штаны-дудачкі, кашуля і даўгі пінжак у тон. У гэты стыль добра ўпішуцца сумка-канверт і туфлі-лодачкі. Мінімалізм — не пра сум і адсутнасць фантазіі, а пра элегантнасць, шык і густ. Можна дадаць упрыгажэнне, але толькі адно — шалік, моназавушніцу, брошку.

### Жывёльны прынт

Чарговы раз «леапард» вяртаецца ў моду. Самы час навучыцца насіць яго правільна. Няхай гэта будуць свабодныя сілуэты (а не да таліі) і арыгінальная расфарбоўка (чырвоная, зялёная гама, напрыклад). Упісаць гэты прынт у паўсядзённы гардэроб можна ў выглядзе абутку. Бярыце прыклад з прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі Тэрэзы Мэй, якая дапаўняе дзелавы касцюм леапардавымі лодачкамі. Папулярнымі будуць таксама ўзоры а-ля тыгр і зебра.

### Джынс з ног да галавы


Папулярнымі будуць джынсавыя камплекты.

Вобраз з дэніму будзе вельмі актуальны. Прынамсі, Oscar de la Renta і Tom Ford, якія прэзентавалі на паказах джынсавыя касцюмы, у гэтым не сумняваюцца. Дызайнеры раяць прыглядзецца да «варонак» і штаноў, пашытых нібы з дзвюх розных па колеры пар. Фасоны — простыя, не перагружаныя лішнімі дэталямі. А вось ірваныя джынсы пакіньце ў шафе да лепшых часоў: у гэтым сезоне яны страчваюць папулярнасць. Пры куплі джута спыніцеся на мадэлі «оверсайз» з аб'ёмнымі накладнымі кішэнямі.

### Шырокі абцас і змяіная скура

Ужо каторы сезон галоўным патрабаваннем да абутку застаецца практычнасць. Таму рабіце стаўку на туфлі на шырокім абцасе. Яны універсальныя і лёгка ўпішуцца ў любы гардэроб. Дызайнеры «рэанімавалі» таксама абцас-кілішак. Насіце яго са штанамі даўжыні 3/4, спадніцамі-аловак, сукенкамі па калена і адчувайце сябе гераіняй рэтра-фільма. З чым такую мадэль лепш не спалучаць, дык гэта з аб'ёмнымі рэчамі: такі ансамбль «з'есць» ваш рост. На што яшчэ варта звярнуць увагу? Падказваем: туфлі са скуры пад змяю, батфорты і грубыя чаравікі.

### Поп-арт


Прынт «поп-арт» для іранічных асоб.

Каб быць бліжэй да сучаснага мастацтва, неабавязкова ісці ў музей. Адзявайце кашулю з выявамі коміксаў і карцін Энздзі Уорхала і, як той казаў, нясіце культуру ў масы. Рэч у духу поп-арт павінна быць цэнтральнай у вашым вобразе: астатнія няхай будуць аднатоннымі і паўтараюць адзін з колераў, што ёсць у прынце. Што яшчэ мусіць быць пры вас, дык гэта пачуццё гумару. І ўсё ж такі, пэўна, давядзецца схадзіць у мастацкі музей, бо, каб іранізаваць над сучаснай культурай, трэба пра яе ведаць.

### Скураны берэт

Не спяшайцеся пазбаўляцца вясной ад галаўных убораў. Тым больш ёсць столькі цікавых варыянтаў. Хочаце запісацца ў шэрагі модніц — купляйце чорны скураны берэт. Насіць яго можна ссунуўшы на патыліцу ці набок, з паліто ці плашчом. Сумняваецеся ў сучаснасці гэтага галоўнага ўбору? Паглядзіце паказы Dior — там дрэнная не параяць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

❍ ЭКСКУРС У ГІСТОРЫЮ

## Падводка вугалем і мышыныя шкуркі

### Як змянялася мода на бровы

**На працягу ўсёй гісторыі жанчыны прыдумвалі, як зрабіць сябе яшчэ прыгажэйшымі. Мянялі ўборы, прычоскі, колер зубоў. Бровы таксама не абышлі ўвагай. Ад поўнасцю збрытых да накленых, ад прамых да выгнутых, ад ледзь прыкметных да «брэжнеўскіх» — якую толькі форму ім не надавалі.**

Эксперыментаваць з бровамі пачалі яшчэ ў старажытнасці. Прычым не толькі жанчыны. У Кітаі мужчыны фарбавалі бровы тушшу, каб выглядаць больш люта і страшыць ворага.

У Сярэдняй Азіі надзвычай прыгожымі лічыліся бровы, якія зрасліся на пераноссі. Таму дзяўчатам з маленства падмалёўвалі іх сокам усьмы. Гэтая расліна — добры сродак для стымуляцыі росту валасоў, таму з часам бровы насамрэч спалучаліся ў адну лінію.

Егіпцянкі наносілі спецыяльны макіяж, які абараняў ад хвароб і злых духаў. Яны малявалі тоўстыя бровы ў форме доўгай дугі (успомніце бюст Неферціці). А калі ў сям'і памірала кошка — свяшчэнная жывёла, — збрывалі іх у знак жалобы. У Старажытным Рыме цанілася монабрыво, якое лічылася прыкметай высокага інтэлекту. Дарэчы, ужо тады ў ходзе былі фальшывыя бровы. Іх выраблялі з шэрсці казы і прыклейвалі дрэўнай смалой.

У Японіі з VIII стагоддзя з'явілася традыцыя «хікімаю»: жанчыны вышчыпвалі свае бровы і малявалі новыя, значна вышэй на лбе, у выглядзе цёмных авалаў. Для гэтага выкарыстоўвалася чарніла, вырабленае з сажы. Кажуць, што ў той час японкі сталі насіць распушчаныя валасы з роўным праборам і лоб выглядаў занадта высокім. Цёмныя авалы дапамагалі збалансаваць форму твару.

Мода на высокі лоб і вышчыпаныя бровы была распаўсюджана ў арыстакратычных колах у сярэднявечнай Еўропе. Яна была. Каноны прыгажосці ў тыя часы сёння ўвогуле здаюцца дзіўнымі. Хваравіта бледны твар, тонкая лебядзіная шыя (для гэтага эфекту збрывалі валасы на патыліцы)... Ёсць версія, што такую моду выклікала неабходнасць: у той час з-за дрэннага харчавання і нізкай якасці жыцця нярэдка хварэлі на рахіт, адным з сімптомаў якога якраз з'яўляецца аблысенне ў вобласці лба.

У XVII стагоддзі знатныя рускія жанчыны падводзілі бровы сурмой. А вясковыя — звычайным вугалем.

Прыгажуні XVIII стагоддзя выкарыстоўвалі накладныя бровы, вырабленыя з... мышыных шкурак. Праўда, замаўляць такім знешнім выглядам жаніхоў было незаконна. Сенат у Франкфурце выдаў указ, па якім шлюб прызнаваўся несапраўдным, калі мужчыну прымушалі ўступіць у яго падманам — напрыклад, жанчына фарбавалася румянамі ці насіла парык.

Калі казаць пра XX стагоддзе, то мода на бровы мянялася літаральна кожныя дзесяць гадоў. У 1920-я ўсе марылі аб такіх, як у амерыканскай актрысы нямога кіно Клары Боу, — тонкіх і прамых. У 1930-я жанчынам таксама даспадобы былі вышчыпаныя бровы, але ў форме выгнутых арак, якія рабілі вобраз больш тэатральным. Дзесяцігоддзе пасля папулярным быў завостраны кончык, які


Шырокія бровы мадэлі Кары Дэлевінь — эталон для сучасных модніц.

модніцы дамалёўвалі алоўкам ледзь не да самай скроні. А ў сярэдзіне мінулага стагоддзя тон задавала Мэрылін Манро са сваімі сексуальна выгнутымі бровамі.

Субкультура хіпі прымусіла жанчын зноў перагледзець сваё стаўленне да броваў. У 1970-я іх сталі менш вышчыпваць, бо цанілася натуральнасць. У 1980-я ў модзе былі бровы, як у мадэлі Брук Шылдс, — шырокія, неахайныя, «дзікія». А ў 1990-я мода кардынальна змянілася: усе сталі марыць аб «нітачках». Тады ж жанчыны актыўна пачалі звяртацца да татуажу броваў: тонкую лінію працяй было набіць у салоне, чым рэгулярна вышчыпваць.

Сёння зноў у модзе натуральнасць. Шырокія бровы, як у мадэляў Кары Дэлевінь і Наталлі Вадзянавай, натхнілі многіх жанчын адрошчваць, зачэсваць і дамалёўваць свае. Што не заўсёды ўдала атрымліваецца. Часам гэта выглядае так, быццам яны, як тыя старажытныя кітайскія мужчыны, сабраліся страшыць ворага. Сённяшняя мода дазваляе не капіраваць нейкую адну форму броваў, а выбіраць тую, што вам больш пасуе. А натуральнасць разумеецца вельмі шырока: дзяўчаты з монабрывам становяцца «зоркамі» інтэрнэту.

## Очередное общее собрание акционеров ОАО «МинскСортСемОвощ» (220014, г. Минск, ул. Кузьмы Минина, д. 21, корп. 1) по решению наблюдательного совета Общества состоится в очной форме 30 марта 2018 года.

**Повестка дня собрания:**

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2017 год и основные направления его деятельности в 2018 году.
2. Отчет наблюдательного совета Общества.
3. Заключение ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2017 год.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности, отчета о распределении прибыли и убытков Общества за 2017 год с учетом заключения ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2017 год и направлений использования чистой прибыли в 2018 году. Выплата дивидендов за 2017 год.
6. Избрание членов наблюдательного совета Общества.
7. Избрание членов ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение условий материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Утверждение отчета комиссии по оказанию безвозмездной (спонсорской) помощи за 2017 год и суммы предоставляемой безвозмездной (спонсорской) помощи на 2018 год.

**Место проведения собрания:** г. Минск, ул. Кузьмы Минина, д. 21, корп. 1 (актовый зал).

**Начало собрания:** 09.00.

Время регистрации участников – в день проведения собрания с 8.30 до 8.55 по месту проведения собрания.

Время ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания – с 9.00 до 16.00 в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная с 9 марта 2018 года, по адресу: г. Минск, ул. Кузьмы Минина, 21, корп. 1.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра по состоянию на 1 марта 2018 года.

Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров – по паспорту и доверенности.

Наблюдательный совет ОАО «МинскСортСемОвощ»

УНП 600052664

## РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 28 февраля 2018 г. в 11.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 50 % после вторых несостоявшихся торгов по продаже объекта недвижимости – здания центральной гребной базы, расположенного по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Перевалочная, 68, принадлежащего Учреждению «Гомельская центральная специализированная детско-юношеская школа олимпийского резерва профсоюзов «Сож» на праве оперативного управления

| № лота | Наименование и адрес объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена продажи, долларов США (в т. ч. НДС по ставке 20 %) | Задаток, долларов США (в т. ч. НДС по ставке 20 %) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание центральной гребной базы, **инв. № 350/С-156880** | Назначение: здание нежилое. Двухэтажное кирпичное строение, 1979 года постройки. Общая площадь 1489,3 кв. м. Составные части и принадлежности: одноэтажная кирпичная пристройка, трехэтажная кирпичная пристройка, два сарая | **135 076, 80** | **2 000, 00** |

***Земельный участок** для обслуживания здания на праве постоянного пользования площадью **0,2394 га** с кадастровым номером 340100000007000144. **Имеется ограничение (обременение) прав на недвижимое имущество (иное): охранная зона теплотрассы (код ограничения 7), площадь 0,027 га.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь*

**Валюта торгов:** доллар США. **Шаг аукциона** – 15 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 27 февраля 2018 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 11.00 **28 февраля 2018 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5%.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления **в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа** на **р/с BY84ALFA30122305700080270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 17 февраля 2018 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 1 % от окончательной цены продажи Объекта (вознаграждение оплачивается в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату подписания протокола о результатах аукциона); в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в течение 30 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке (стоимость Объекта оплачивается в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа за минусом ранее внесенного задатка).

Извещения о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту были опубликованы в газете «Звязда» от 14.09.2017 г. № 177, от 23.12.2017 г. № 248.

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. Тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-00-70; 32-18-95 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by. Продавец: Гомельская ЦСДЮШОР профсоюзов «Сож», г. Гомель, ул. Советская, 29. Тел.: 8 (0232) 32-91-15, 32-96-19, (029) 308-58-38**

## Информация о формировании реестра акционеров

ОАО «Амкодор-КЭЗ», Витебская обл., Толочинский район, г. п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3, на основании решения Совета директоров общества от 15 февраля 2018 года для проведения очередного (годового) общего собрания акционеров определило дату формирования реестра акционеров – 1 марта 2018 года. УНП 300028841

## ОАО «ЭнКоСтрой» (г. Минск, ул. Монтажников, 39-201) проводит очередное общее собрание акционеров ОАО «ЭнКоСтрой» в очной форме 19 марта 2018 года в 11.00. Место проведения собрания: ОАО «ЭнКоСтрой», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208

**Повестка дня собрания:**

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2017 год и основные направления деятельности общества в 2018 г.
2. Утверждение годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2017 г.
3. Утверждение распределения прибыли Общества за 2017 г.
4. О материальном вознаграждении членов совета директоров и ревизионной комиссии общества.
5. Избрание членов совета директоров и ревизионной комиссии общества.
6. О сделках общества.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться в день проведения собрания с 10.00 до 10.45 по адресу: ОАО «ЭнКоСтрой», г. Минск, ул. Монтажников, 39 к. 208.

Участники собрания должны иметь при себе документ, удостоверяющий личность (представители акционера – документ, удостоверяющий личность и доверенность).

Дата составления списка владельцев ценных бумаг для регистрации участников собрания по состоянию реестра акционеров на 09.03.2018 г.

Время и место ознакомления лиц, имеющих право на участие в собрании, с материалами по вопросам повестки дня общего собрания: с 9.00 до 9.30, в рабочие дни с 01.03.2018 г. по 19.03.2018 г. по адресу: ОАО «ЭнКоСтрой», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

УНП 191303197

## 19 марта 2018 года в 11.00 состоится общее собрание акционеров совместного предприятия закрытое акционерное общество «Могилевский химкомбинат «Заря» с повесткой дня

1. Отчет директора о проделанной работе за 2017 год.

2. Итоги производственно-хозяйственной деятельности СП ЗАО «МХЗ» за 2017 год.

Утверждение годовых отчетов, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2017 год.

3. Распределение прибыли (убытков) по результатам работы за 2017 г.

4. Отчет ревизионной комиссии.

5. Основные направления деятельности СП ЗАО «МХЗ» на 2018 год. Утверждение плана производства, финансового плана и плана организационно-технических мероприятий на 2018 год.

7. Избрание членов Наблюдательного совета общества.

8. Избрание членов ревизионной комиссии общества.

8. Утверждение размеров вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.

9. Принятие решения о подаче заявления совместного предприятия закрытое акционерное общество «Могилевский химкомбинат «Заря» в экономический суд Могилевской области о признании предприятия экономически несостоятельным (банкротом).

10.Определение лица, полномочного на подписание заявления совместного предприятия закрытое акционерное общество «Могилевский химкомбинат «Заря» в экономический суд Могилевской области о признании предприятия экономически несостоятельным (банкротом).

Начало регистрации участников собрания в 10.00. Окончание регистрации в 10.45.

Место проведения собрания: г. Могилев, пр. Шмидта, 114 (актовый зал)

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг СП ЗАО «МХЗ» для составления списка лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, – 30 января 2018 г.

Лица, имеющие право на участие в собрании, имеют право ознакомиться с информацией о деятельности общества за отчетный период, начиная с 28 февраля 2018 г. по месту нахождения общества.

Регистрация производится при предъявлении документа, удостоверяющего личность, для представителя акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет

УНП 700210051

